

САМАЛЁТ, ЯКІ НЕ ВЯРНУЎСЯ З БОЮ

11

УСЯ ПРАЎДА ПРА ГЛУТАМАТ НАТРЫЮ

12



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

9 ВЕРАСНЯ 2023 г. СУБОТА № 175 (30055)

## ЛІЧБА ДНЯ

**Звыш 7 мільёнаў тон збожжа**

*намалочана ў Беларусі. Аб гэтым паведамілі ў Міністэрстве сельскай гаспадаркі і харчавання. Сабрана 6,1 мільёна тон збожжавых і зернебабовых культур, а таксама каля мільёна тон рапсу. Уборка кукурузы на зерне вядзецца ў трох абласцях краіны: Брэсцкай, Мінскай і Гомельскай. Убрана каля 1,6 тысячы гектараў. Намалочана амаль 12 тысяч тон збожжа. Працягваецца ўборка крупяных культур: грэчкі намалочана 18,2 тысячы тон, проса — 11 тысяч тон. Накапана каля 88 тысяч тон бульбы, а таксама звыш 193 тысяч тон цукровых буракоў.*

## КОРАТКА

- **Дзяржузнагарод удастоены 60 прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці.**
- Беларусь і Расія рыхтуюць новыя імпартазамяшчальныя праекты.
- **На пасяджэнні АСВОД выбралі новага старшыню аб'яднання. Па ўзгадненні з кіраўніком дзяржавы новым старшынёй АСВОД стаў Андрэй Чарняўскі.**
- Генпракуратура: фашысты падчас акупацыі знішчылі больш за 11,7 тысячы беларускіх сёл і вёсак.
- **Партыю беларускага соладу ўпершыню адгрузілі ў Экватарыяльную Гвінею.**
- Новы адукацыйны сезон стартуе ў «Школах юных» БДУ.
- **Медыцынскае аддзяленне Рэспубліканскага рэабілітацыйнага цэнтра для дзяцей-інвалідаў адкрылася пасля рамонту.**
- Новыя гібрыды таматаў з назапашваннем антацыянаў выпрабоўваюцца ў БДСГА.

# ПЕРШАЯ ПРЫГАЖУНЯ КРАІНЫ

## «Міс Беларусь — 2023» стала Элеанора Качалоўская



Фота БелТА.

**Канцэнтрацыя таленту і прыгажосці, феерыя маладосці і творчасці, шчырая і прынцыповая барацьба — у Палацы спорту прайшоў фінал XIII Нацыянальнага конкурсу «Міс Беларусь — 2023». Гэты вечар стаў прыгожай кропкай і ў рабочым графіку Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. Кіраўнік дзяржавы таксама наведаў шоу ў Палацы спорту.**

Сёлета за тытул спрачаліся 24 дзяўчыны, якія прадстаўляюць кожны рэгіён краіны. Асноўная ідэя фінальнага шоу звязана з прыгажосцю як натхняльнай сілай для подзвігаў і творчых перамог, што вельмі сімвалічна ў Год міру і стваральнай працы.

У фінале ўдзельніцы конкурсу прадставілі публіцы пяць традыцыйных выхадаў, сярод іх — дэфіле ў народных касцюмах, купальніках, дзелавых касцюмах і заключны — у вечаровых сукенках. Хоць «Міс Беларусь» — гэта конкурс прыгажосці, журы ацэньвала не толькі знешнасць удзельніц, але і іх інтэлект, уменне падаць сябе і ўнутраную прыгажосць.

Арганізатары падрыхтавалі для гледачоў яркае шоу, напоўненае выступленнямі як знакамітых, так і пачынаючых артыстаў эстрады. Дадавала ўражанняў і візуальнае афармленне, якое суправаджалася спецэфектамі.

Кожная ўдзельніца вартая кароны, але па правілах пераможца толькі адна. «Міс Беларусь — 2023» стала Элеанора Качалоўская. Першыя эмоцыі пераможцы — шок і шчасце, якога яна не хавала. Як расказала Элеанора, яе найбліжэйшыя планы — наведаць тэатр імя Янкі Купалы і паглядзець спектакль «Паўлінка». Падчас інтэлектуальнага конкурсу дзяўчына адказвала на пытанне, звязанае з творчасцю класіка. Але ад хвалявання правільна адказаць не змагла. Затое сваю памылку прызнала і абяцала выправіць. Ды і гэта было зусім не галоўным.

СТАР. 2

### Абарона асабістага

## НА АПЕРАТАРА СПАДЗЯВАЙСЯ, АЛЕ І САМ НЕ ПАДДАВАЙСЯ!

### Як правільна распараджацца персанальнымі данымі іх уладальнікам і карыстальнікам




**Вывешванне на агульны агляд спісаў даўжнікоў, якія не заплацілі камунальныя плацяжы ці ўзносы ў садовае таварыства, укараненне сістэм відэасувязі ў кабінетах урачоў, дзе яны прымаюць пацыентаў, ці на жылым доме, патрабаванне пашпартных даных пры звароце білета на канцэрт, сістэма распазнавання асоб па тварах у дзіцячым садку... Гэтыя і шмат якія іншыя прыклады выкарыстання персанальных даных (ПД) непакояць людзей і вымушаюць задумацца, ці можна так рабіць. Пры гэтым часта ініцыятарам доступу да асабістых звестак чалавека становяцца не толькі аператары арганізацый, якія іх апрацоўваюць, але і сам іх уладальнік, які бяздумна раздае іх направа і налева. Як не страціць ПД і папярэдзіць іх крадзеж, каму прад'яўляць прэтэнзіі за празмернае іх ужыванне, калі можна забараніць выкарыстанне інфармацыі пра чалавека? Пра ўсё гэта можна было даведацца на Дні адкрытых дзвярэй, які адбыўся ў Нацыянальным цэнтры абароны персанальных даных.**

СТАР. 4

### Спажывец

## РАЙСКІ САД

### Як выбраць саджанцы, якія прыжывуцца?



**Найлепшы час для пакупкі саджанцаў — канец верасня — кастрычнік, але на рынках Беларусі яшчэ тыдзень-паўтара таму разгарнуўся бойкі гандаль маладымі дрэўцамі і кустамі. Як выбраць якасныя саджанцы, каб будучы сад парадаваў пышным красаваннем і сакавітым ураджаем, а не расчараваў садоўніка-аматара?**

Зрэшты, аматараў сярод заўзятых дачнікаў няшмат: пакупнікоў саджанцаў можна аднесці практычна да прафесійных садоўнікаў.

— Я заўсёды перад паходам па саджанцы спачатку складаю спіс раслін, якія хацеў бы набыць, — дзеліцца пенсіянер, пакупнік сталічнай Камароўкі. — Сад у мяне невялікі, і спачатку я дакладна вырашаю, дзе будзе пасаджана новае дрэўца або кусцік, знаходжу яму найлепшае месца. І ўлічваю, што я ўжо чалавек пажылы, а кожнае новае дрэўца ці кусцік запатрабуе і часу, і намаганняў.

СТАР. 13

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2023 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

Афіцыйна

# ЗАДЗЕЛ НА БУДУЧЫНЮ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка асабіста праводзіў Прэзідэнта Экватарыяльнай Гвінеі Тэадора Абіянга Нгему Мбасога ў аэрапорце пасля завяршэння яго афіцыйнага візіту**

**Як паведамлялася раней, лідар гэтай афрыканскай краіны прыбыў у Беларусь вечарам 6 верасня. Праграма візіту была вельмі насычанай і ўключала афіцыйныя перагаворы з Прэзідэнтам Беларусі ў Палацы Незалежнасці, падпісанне двухбаковых дакументаў, наведванне прадпрыемстваў, азнаямленне з магчымасцямі беларускіх вытворцаў. Беларусь і Экватарыяльная Гвінея разлічваюць да 2030 года перасягнуць аб'ём тавараабароту $100 млн. Размова таксама ідзе аб развіцці вытворчай кааперацыі, садзейнічанні ў падрыхтоўцы кадраў для розных галін народнай гаспадаркі Экватарыяльнай Гвінеі.**

Тэадора Абіянг Нгема Мбасога выказаў удзячнасць беларускаму боку за праяўлены дружалюбны падыход і гатоўнасць да сумеснай работы. «Мы падзяляем гатоўнасць да рэалізацыі сумеснай эфектыўнай работы, да рэальнай кааперацыі, якая дасць магчымасць нам рэалізаваць патэнцыял нашых краін, — падкрэсліў ён. — Відавочна, што гэта супрацоўніцтва можа стаць своеасаблівай платформай не толькі для таго, каб дапамагчы Экватарыяльнай Гвінеі, але і іншым афрыканскім дзяржавам, якія пакутуюць ад крайняй галечы».

Па выніках перагавораў прэзідэнтаў Беларусі і Экватарыяльнай Гвінеі падпісаны шэраг міжнародных дакументаў. Сярод іх — міжурадавае рамачнае пагадненне аб эканамічным, гандлёвым, культурным, навуковым і тэхнічным супрацоўніцтве, пагадненне аб безвізавых паездках для ўладальнікаў дыпламатычных і службовых пашпартоў. Таксама падпісаны пагадненні аб супрацоўніцтве ў сферы аховы здароўя і галіне адукацыі, мемарандум аб узаемаразуменні паміж профільнымі ведамствамі двух краін па пытаннях супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі. Пагадненне заключылі Міністэрства культуры Беларусі і Міністэрства культуры, рамёстваў і турызму Экватарыяльнай Гвінеі.

«Зроблены добры задзел на будучыню, — ацаніў праведзеную работу Прэзідэнт Беларусі. — Мы вызначылі перспектыўныя сферы і напрамкі развіцця партнёрства. Узгаднілі практычныя крокі па рэалізацыі дасягнутых дамоўленасцяў, дамовіліся аб абменах візітамі, абазначылі асновы дагаворна-прававой базы, стварылі сумесную камісію па эканамічным супрацоўніцтве».

У рамках афіцыйнага візіту ў Беларусь Прэзідэнт Экватарыяльнай Гвінеі наведаў агракамбінат «Дзяржынскі». Гасцям прадставілі выставу прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў харчовай прамысловасці, у прыватнасці, мясную, малочную, хлебабулачную і іншую прадукцыю.

«Нам трэба выбудоўваць масткі з афрыканскімі краінамі, — заўважыў намеснік прэм'ер-міністра Леанід Заяц. — Прыемна, што ў Беларусь з афіцыйным візітам прыехаў Прэзідэнт Экватарыяльнай Гвінеі. Ён зацікаўлены ў цесным супрацоўніцтве з нашай краінай. Яму цікавы перадавыя тэхналогіі ў сельскай гаспадарцы, прамысловасці, медыцыне, адукацыі».

Паводле яго слоў, Беларусі таксама цікавы афрыканскі рынак. «Гэта новы кантынент для нашай краіны, — удакладніў віцэ-прэм'ер. — Мы пачынаем першыя крокі ў частцы супрацоўніцтва па розных напрамках. Бачым, што наша выстава харчовых прадуктаў уразіла і зацікавіла гасцей. Мы можам пастаўляць сухое малако, там яго перапрацоўваць і рэалізоўваць не толькі ў Экватарыяльнай Гвінеі, але і на ўсім Афрыканскім кантыненце».

Афіцыйны візіт Прэзідэнта Рэспублікі Экватарыяльная Гвінея ў Рэспубліку Беларусь з'яўляецца працягам курсу нашай краіны на актывізацыю супрацоўніцтва з краінамі Афрыкі і пацвярджае ўзаемную цікавасць да ўзаемадзеяння.

# ПЕРШАЯ ПРЫГАЖУНЯ КРАІНЫ

*(Заканчэнне.*
*Пачатак на 1-й стар.)*

«Я не магу да канца паверыць, што гэта праўда. Здаецца, што ўсё яшчэ ідзе рэпетыцыя, мы столькі разоў рэпеціравалі. Але я гляджу на журналістаў, адчуваю карону на галаве і разумею, што гэта праўда. Я шакаваная, шчаслівая і вельмі ўдзячная ўсім, хто мяне падтрымліваў і дапамагаў», — падзялілася Эленаора.

«Міс Беларусь» падкрэсліла, што прысутнасць Прэзідэнта ў зале яе натхняла і падбадзёрвала. «Я адчувала, што ён падтрымліваў кожную ўдзельніцу і за кожную хваляваўся. Таму падчас дэфіле мне было спакайней, калі я глядзела на Прэзідэнта і на сваю маму», — адзначыла яна. Першая прыгажуня Беларусі таксама падзялілася, якім бачыць ідэал мужчыны: ён павінен быць шчырым, мужным і добрым. Расказала Элеанора і пра сваю мару — дастойна прадставіць Беларусь на міжнародным конкурсе прыгажосці, паказаць усяму свету прыгожосць нашай краіны. Такая магчымасць выдасца зусім хутка. Элеанора будзе прадстаўляць Беларусь на конкурсе «Міс Свет», які пройдзе 8 снежня ў індыйскім горадзе Срынагар.

Элеанора — з Мінска. Дзяўчына скончыла БДУКМ, цяпер атрымлівае другую вышэйшую адукацыю псіхолага ў педагагічным універсітэце і паралельна працуе менеджарам мадэльнага агенцтва ў Нацыянальнай школе прыгажосці. Яна распавяла, што адчувае велізарнае пачуццё падзякі сваёй краіне, і адрасавала словы ўдзячнасці асабіста кіраўніку беларускай дзяржавы: «Аляксандр Рыгоравіч, дзякуй, што вы даяце простым дзяўчатам магчымасць апынуцца ў гэтай казцы». Элеанора Качалоўская запэўніла, што будзе горда і сумленна несці тытул у найбліжэйшыя два гады.

Званне першай віцэ-міс прысуджана Ксеніі Уласюк, другой віцэ-міс стала Мілана Якімовіч. У намінацыі «Міс фота» перамогу атрымала Аліна Герасіменка.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

З нагоды

# «СВЯТА, НАПОЎНЕНАЕ ПАЧУЦЦЁМ АГУЛЬНАГА ЯДНАННЯ»

**Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Наталля Качанава павіншавала кіраўніцтва, жыхароў і гасцей сталіцы з Днём горада.**

«Ад імя Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і сябе асабіста шчыра віншую вас з Днём горада. Гэта асаблівае свята, напоўненае пачуццём агульнага яднання, любові і гонару за нашу сталіцу, якая квітнее, — адзначаецца ў віншаванні. — Горад-герой Мінск — сучасны, перспектыўны мегаполіс, які дынамічна развіваецца. У ім сканцэнтраваны цэнтры дзелавога, палітычнага, навуковага і культурнага жыцця Беларусі.

Галоўнай рухальнай сілай ва ўсе часы былі, застаюцца і будуць мінчане — працавітыя і адказныя, энергічныя і мэтанакіраваныя, творчыя і прадпрымальныя. Дзякуючы гараджанам ствараліся слаўныя традыцыі, зберагаліся і прымнажаліся багацці і здабыткі беларускай сталіцы. Сёння жыхары, якія бязмежна любяць свой горад, працягваюць уносіць стваральны ўклад ва ўмацаванне эканамічнага і інтэлектуальнага патэнцыялу дарагога сэрцу Мінска, робячы яго ўсё больш прывабным і камфортным для жыцця.

Ад усёй душы жадаю вам невычэрпнай энергіі, жыццёвага аптымізму, новых прафесійных здзяйсненняў у імя геройчнага мінулага і паспяховай будучыні нашай цудоўнай сталіцы і роднай Беларусі.

Моцнага здароўя, шчасця, міру і дабра вам і вашым сем'ям».

Акцыя

# СЦЯГІ Ў ЗНАК АДЗІНСТВА



**Магілёўская вобласць першая пасля Мінскай далучылася да рэспубліканскай акцыі «Сімвал адзінства 2023». Учора аўтакалона, упрыгожаная дзяржаўнай сімволікай і сцяжкамі, праехала праз цэнтр Магілёва і завітала на плошчу Славы. Падтрымаць акцыю прыйшлі каля 600 прадстаўнікоў працоўных калектываў і моладзі. Юнакі і дзяўчаты ў нацыянальных касцюмах трымалі ў руках карабачкі са складзенымі ў іх сцягамі Магілёва і Бабруйска, а таксама 20 раёнаў вобласці. Цырымонія перадачы пачалася з гімна.**

На фоне ўрачыстай музыкі прагучалі словы пра тое, што сабой уяўляе акцыя. З мэтай стварэння гістарычных і новых геральдычных сімвалаў з 1996 да 2005 года Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь былі зацверджаны афіцыяльныя геральдычныя сімвалы адміністрацыйна-тэрытарыяльных адзінак Магілёўскай вобласці. Сучасныя геральдычныя сімвалы Прыдняпроўскага краю ствараліся пры непасрэдным удзеле старшыні Магілёўскай абласной арганізацыі Беларускага грамадскага аб'яднання ветэранаў Анатоля Глаза, які на той час узначальваў арганізацыйны камітэт па ўзнаўленні сімвалаў кожнага раёна і нашай вобласці.

— Мы зыходзілі пры іх стварэнні з таго, каб улічыць усё гістарычнае, што было на нашай тэрыторыі, і каб яны ў поўнай меры адлюстроўвалі тыя традыцыі, якія ўласцівыя раёну, — падкрэсліў Анатоль Ціханавіч у сваёй прамове. — У 2005 годзе Прэзідэнтам былі зацверджаны герб і сцяг нашай вобласці. Герб увасобіў у сабе ўсе традыцыі, якія існавалі на зямлі беларускай, вянчае яго ікона Бялыніцкай Божай Маці, якая шануецца ўсімі канфесіямі.

Анатоль Глаз падкрэсліў, што прымаць у сябе патрыётаў Беларусі з такой светлай і важнай місіяй — вялікі гонар. «Патрыятызм — абавязак кожнага, хто жыве на зямлі, — перакананы ён. — Больш моцнага падмурка для дзяржавы і грамадства, чым патрыятызм, свет яшчэ не прыдумаў. І калі мы будзем мець такі падмурак, нам ніякія выпрабаванні не страшныя».

Ва ўрачыстай атмасферы адбылася перадача сцягаў раёнаў Магілёўскай вобласці грамадскаму аб'яднанню «Патрыёты Беларусі» для далейшай устаноўкі на алеі Адзінства ў сталіцы Беларусі. Мэта акцыі — кансалідацыя грамадства адзінай ідэяй міру і стварэння пад сімваламі рэгіёнаў, нагадаў прысутным старшыня грамадскай арганізацыі «Патрыёты Беларусі» Мікалай Зарубіцкі.



— Трэці год мы праводзім гэтую акцыю і знаходзім гарачую падтрымку, — адзначыў ён. — У 2021-м аб'ехалі ўсе 118 райцэнтраў і сабралі зерне. Гэты праект быў ушанаваны Прэзідэнцкай прэміяй «За духоўнае адраджэнне». Летась збіралі шасцярэнькі пад дэвізам: «Мы ўсе адзіны механізм». Сёлета вырашылі яшчэ больш шырокім сэнсам напоўніць акцыю і стварыць алею рэгіёнаў у Мінску. Алею Адзінства, якая збярэ сцягі ўсіх гарадоў і раённых цэнтраў Беларусі. Пад кожным сцягам будзе ўстаноўлена таблічка з QR-кодам, каб любы ахвотны мог даведацца пра гісторыю і славутасці канкрэтнага раёна. Гэта будзе вельмі цікавы аб'ект для турыстаў.

Аляксандра Лазарава, вучаніца Магілёўскай школы № 31, — адна з пераможцаў шоу «Выклік», які арганізоўвалі «Патрыёты Беларусі». Дзяўчына лічыць, што вельмі важна захаваць патрыятычны дух і сваім удзелам паказваць іншым аднагодкам прыклад.

— Патрыятызм — гэта крута, — кажа яна. — Гэта магчымасць прадэманстраваць сваю любоў да радзімы. У мяне гэта пачуццё развілося ад любові да прыроды. І я рада, што знайшла аднадумцаў сярод патрыётаў Беларусі. Вельмі шчаслівая, што з імі пазнаёмілася. Тут людзі, аб'яднаныя адной мэтай. Мы жадаем, каб наша краіна квітнела.

Пасля афіцыйнай часткі на плошчы Славы ў музеі гісторыі Магілёва адбылася дыялогавая пляцоўка, спікерам якой выступіў беларускі палітолаг Аляксей Дзермант. Ён расказаў моладзі, што вельмі важна быць разам і жыць як адна вялікая сям'я ў агульным доме пад назвай Беларусь.

Учора ў рамках мерапрыемстваў, прымеркаваных да Дня народнага адзінства, грамадская арганізацыя «Белая Русь» правяла ў Горках грамадска-палітычны марафон «17 граняў адзінства». Удзел у ім прымалі прадстаўнікі арганізацыі Шклоўскага, Дрыбінскага і Мсціслаўскага раёнаў. У праграме адбылася семінар-практыкум, круглы стол з удзелам дэпутата Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, старшыні Пастаяннай камісіі па адукацыі, культуры і навуцы Ігара Марзалюка і першага сакратара Цэнтральнага камітэта БРСМ Аляксандра Лук'янава.

**Нэлі ЗІГУЛЯ,**
**фота аўтара.**

Падзея

# Імкненне развівацца і рухацца наперад

## Гродна адзначае 895-годдзе

**Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КАРАНІК павіншаваў жыхароў Гродна падчас урачыстага мерапрыемства з нагоды 895-годдзя горада, паведаміла БелТА.**



«Мне вельмі прыемна віншаваць любімы горад і сваіх землякоў з юбілеем. За 895-гадовую гісторыю наш горад перажыў многае. Былі як светлыя, так і цёмныя старонкі. Неадойчы яму даводзілася падымацца з папялішчаў і руін. Але як бы ні было складана і цяжка, імкненне развівацца і рухацца наперад заставалася нязменным», — адзначыў Уладзімір Каранік.

Кіраўнік вобласці дадаў: «Сённяшні Гродна здзіўляе і захапляе жыхароў і гасцей, дэманструючы пышнасць і разнастайнасць. У ім арганічна пераплятаюцца вузкія атмасферныя вулачкі і шырокія праспекты з сучаснымі развязкамі. Будынкі з векавой гісторыяй і яркія аб'екты сучаснай архітэктуры. Шырокія паркі і сучасныя прадпрыемствы, якія працуюць ва ўдарным тэмпе. У ім адчуваецца шматвекавая мудрасць, якая сыходзіць каранямі ў мінулае, і накіраваная ў будучыню бурлівая энергія юнацтва».

«Усё гэта стала рэальнасцю толькі таму, што ў Прынёманскім краі заўсёды жылі і жывуць выдатныя людзі. Сапраўдныя патрыёты малой радзімы і сваёй краіны, тыя, хто любіць і ўмее працаваць, хто шануе мір, спакой, стваральную працу і развіццё. Людзі, якія сваімі рукамі стварылі жамчужыну Беларусі, — як дакладна і вобразна выказаўся наш Прэзідэнт», — адзначыў Уладзімір Каранік.

Ён перакананы ў тым, што, нягледзячы на цяжкасці, якія ўзнікаюць, з кожным годам у каштоўнай каралі дасягненняў Гродзенскага краю будуць дадавацца новыя жамчужыны. «Нідзе зоркі не свецяць так ярка, як у горадзе дзяцінства», — сцвярджаў кінагерой. Дык няхай неба заўсёды будзе чыстым, а зоркі яркімі для ўсіх, каму Гродна стаў і стане родным. Хто ўласнай працай і розумам прымнажае яго славу», — пажадаў Уладзімір Каранік.

Супрацоўніцтва

# У МАГІЛЁВЕ ПРОЙДЗЕ ФОРУМ ПА ІМПАРТАЗАМЯШЧЭННІ «ЗРОБЛЕНА Ў РАСІІ»

**Міжнародны форум па імпартазамяшчэнні «Зроблена ў Расіі» пройдзе 25—27 кастрычніка ў Магілёве. Маштабную эканамічную падзею анансаваў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль ІСАЧАНКА падчас візіту дэлегацыі рэгіёна ў Хабараўскі край, паведаміла БелТА.**

Рабочы візіт праходзіць да 10 верасня. Яго праграма прадугледжвае пасяджэнні рабочых груп па супрацоўніцтве і ўрачыстыя прыёмы, наведванне прадпрыемстваў, а таксама ўдзел у выставе-кірмашы беларускіх вытворцаў і V Далёкаўсходнім форуме прадпрымальнікаў. «У Хабараўскі край прыбыла шматлікая беларуская дэлегацыя, што падкрэслівае вялікую цікавасць да гэтага расійскаму рэгіёна з боку прадпрыемстваў і бізнес-колаў нашай краіны, — адзначыў Анатоль Ісачанка. — Дзякуючы дасягнутым раней дамоўленасцям па супрацоўніцтве паміж Беларуссю і Хабараўскім краем назіраецца рост узаемнага тавараабароту, які па выніках 2022 года павялічыўся ў 2,3 раза».

Бакі абмеркавалі шырокі пералік пытанняў, падвялі вынікі за паўгоддзе па рэалізацыі дамоўленасцяў у гандлёва-эканамічным, інвестыцыйным і бізнес-супрацоўніцтве. Таксама была разгледжана сумесная работа ў сферы прамысловасці і паставак беларускай тэхнікі, абмяркоўвалася тэма сельскай гаспадаркі і міжрэгіянальнага ўзаемадзеяння Хабараўска і Магілёва. Не засталіся ўбаку такія важныя кірункі, як турызм, адукацыя і маральна-патрыятычнае выхаванне моладзі.

На сустрэчы прагучала ініцыятыва стварэння ў Хабараўскам краі адзінага сэрвіснага цэнтра па абслугоўванні беларускай тэхнікі. У першую чаргу гэта дазволіць пакупнікам своечасова праходзіць якаснае тэхабслугоўванне, а таксама забяспечыць наяўнасць і бесперабойную пастаўку неабходных запчастак і дэталяў. Па словах Анатоля Ісачанкі, пытанне стварэння цэнтра патрабуе асобнай прапрацоўкі, бо для ўвасаблення ідэі ў жыццё трэба скаардынаваць работу некалькіх айчынных вытворцаў, уніфікаваць падыходы да абслугоўвання гэтых агрэгатаў і, што немалаважна, вызначыцца з партнёрам з боку Расіі.

Са свайго боку **губернатар Хабараўскага краю Міхаіл ДЗЕГЦЯРОЎ** звярнуў увагу, што гандаль паміж Беларуссю і Хабараўскім краем падвоіўся ў абсалютных лічбах. Гэта адбылося пасля падпісання ў маі мінулага года пагаднення аб узаемадзеянні і супрацоўніцтве ў гандлёва-эканамічнай, навукова-тэхнічнай, сацыяльнай і культурнай сферах. «Нашы прадпрымальнікі пастаўляюць прадукцыю ў Беларусь, а беларускія — да нас, — адзначыў Міхаіл Дзегцяроў. — Аднак ключавая і чаканая падзея — стварэнне ў нас сэрвіснага дылерскага цэнтра па абслугоўванні ўсіх брэндаў беларускага машынабудавання. Важна і тое, што беларуска-расійскае супрацоўніцтва пашыраецца не толькі ў эканоміцы. Мы працягваем рэалізацыю сумесных праектаў у сацыяльнай сферы, маладзёжнай палітыцы, турызме».

Як падкрэсліў Анатоль Ісачанка, у нашых краін шмат кірункаў для супрацоўніцтва і далейшага развіцця. «Усе пытанні і ініцыятывы, якія прагучалі падчас сённяшняй сустрэчы, мы ў поўнай меры абмяркуем 25 кастрычніка ў Магілёве, дзе пройдзе міжнародны форум па імпартазамяшчэнні «Зроблена ў Расіі», — падкрэсліў губернатар. — На пляцоўцы нашага абласнога цэнтра збяруцца прадстаўнікі бізнес-колаў з рэгіёнаў-партнёраў Расіі, а таксама кіраўнікі буйных беларускіх прадпрыемстваў, у тым ліку МАЗа, БЕЛАЗа, Мінскага трактарнага завода, ААТ «Белшына», ААТ «Магілёўліфтмаш». Далучыцца да форуму і малы бізнес з усіх рэгіёнаў нашай краіны. Дарэчы, праект падтрыманы Пасольствам Расіі ў Беларусі».

Тры пытанні да ўлады

# ЧЫМ ЖЫВЕ ТАЛАЧЫНСКІ КРАЙ

**Талачынскі раён Віцебскай вобласці ў мінулым годзе ўвайшоў у лік найлепшых рэгіёнаў краіны, дзе створаны ўмовы для паспяховага развіцця бізнесу. Аб інвестыцыйным патэнцыяле, ходзе ўборачнай кампаніі і культурных брэндах раёна расказаў старшыня Талачынскага райвыканкама Алег ЛЫНДЗІН.**



***— Алег Міхайлавіч, як праходзіць сёлета ўборка палёў?***

— Уборачная кампанія на Талачыншчыне праходзіць у стабільным рэжыме. Сёлета ўборцы падлягала 20 032 гектары збожжавых і зернебабовых культур, сярэдняя ўраджайнасць склала каля 30 цэнтнераў з гектара — да ўзроўню мінулага года мы крыху не дацягнулі, аднак, улічваючы капрызы надвор'я ў гэтым годзе, ураджай нядрэнны якасці.

У мэтах правядзення кампаніі своечасова і ў тэхналагічныя тэрміны падрыхтоўчаму этапу была ўдзелена асаблівая ўвага. Да пачатку страды ўборачная тэхніка прайшла неабходнае абслугоўванне і атрымала допуск да палявых работ. І заслуга ў гэтым не толькі інжынерных службаў сельгаспрадпрыемстваў, але і простых працаўнікоў вёскі, якія сення з'яўляюцца ключавымі фігурамі ў бітве за ўраджай, і яны павінны быць упэўнены, што іх інтарэсы абаронены. Гэтая роля адведзена прафсаюзам, якія з пачатку ўборкі актыўна ўключыліся ў працэс арганізацыі і правядзення кампаніі. Усе работнікі на 100 працэнтаў забяспечаны спецвопраткай, арганізавана спаборніцтва сярод экіпажаў, камбайнераў і вадзіцеляў на адвозцы збожжа, у тым ліку сярод моладзі. Прафсаюзныя лідары ажыццяўляюць кантроль арганізацыі харчавання работнікаў, занятых на ўборцы, выкананне патрабаванняў аховы працы на ўсіх аб'ектах і ўчастках.

Усяго ва ўборачнай кампаніі ўдзельнічаюць 14 прадпрыемстваў, больш за 215 адзінак тэхнікі, з іх 81 камбайн. Забяспечанасць тэхнікай стапрацэнтная. Лідарамі на ўборцы збожжа сталі РУП «Талачынскі кансервавы завод», ААТ «Друцк-АГРА», ААТ «Обальцы» і УП «Рыдомльскі». Пры гэтым ураджайнасць палёў кансервавага завода склала каля 50 ц/га.

Аграрыі раёна прыступілі да ўборкі бульбы, самыя вялікія палі з другім хлебам знаходзяцца менавіта ў нас. Талачыншчыну нездарма называюць бульбяным краем, яе тут вырошчваюць даўно і ў вялікіх аб'ёмах. У гэтым сезоне пасяўную плошчу павялічылі да 1,1 тысячы гектараў. Флагман гэтай вытворчасці — Талачынскі кансервавы завод, дзе вырошчваюць з дзясятак сартоў рознай групы спеласці. Акцэнт у рэгіёне зроблены на перапрацоўку ўраджаю — паспяхова завод асвоіў выпуск паўфабрыката «Бульба фры». Беларускі вытворца склаў замежнікам высокую канкурэнцыю. Вопыт, перадавыя тэхналогіі і навуковы падыход — адсюль і вынік.

***— Які аб'ём інвестыцый быў прыцягнуты ў раён у гэтым годзе?***

— За студзень—ліпень 2023 года арганізацыямі раёна выкарыстана 23,3 мільёна рублёў інвестыцый у асноўны капітал або 115,4 % да студзеня—ліпеня 2022 года, будаўніча-мантажныя работы выканаты на 5,1 мільёна рублёў.

У бягучым годзе завершана рэалізацыя трох інфраструктурных інвестыцыйных праектаў, якія значна палепшылі якасць жыцця насельніцтва. Гэта рэканструкцыя цэнтральнай кацельні ў горадзе Талачын (аб'ём укладзеных інвестыцый у 2023 годзе — 569 тысяч рублёў), рэканструкцыя моста праз раку Сакалянка ў гарадскім пасёлку Коханава (аб'ём укладзеных інвестыцый у 2023 годзе — 1,1 мільёна рублёў) і будаўніцтва станцыі абезжалезвання вады ў аграгарадку Жукнева (аб'ём укладзеных інвестыцый у 2023 годзе — 194 тысячы рублёў).

Актыўна вядуцца работы па будаўніцтве памяшкання для ўтрымання кароў сухастойнага перыяду СГФ «Надзёжына» УП «Талачынскі Элеватар-Агра»; рэканструкцыі ліній аптычнага валакна ў населеных пунктах Талачынскага раёна; будаўніцтве сістэмы крапельнага арашэння саду на плошчы 120 гектараў РУП «Талачынскі кансервавы завод».

У раёне рэалізоўваецца даручэнне Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «1 АТЕ — 1 праект», наш рэгіён не стаў выключэннем. Плануецца адкрыць вытворчасць па выпуску панэляў для будаўніцтва драўляных дамоў, як аднапавярховых, так і шматпавярховых. У першую чаргу вытворчасць нацэлена на рынак Расіі. Таварыства з абмежаванай адказнасцю «Салід Вуд» пачало рэалізацыю інвестыцыйнага праекта «Арганізацыя вытворчасці крыжавана-клееных панэляў (CLT-панэляў)». У прадпрыемства на тэрыторыі рэгіёна маюцца свабодныя плошчы, дзе вядуцца падрыхтоўчыя работы па рамонце фасада будынка і правядзенні ўнутраных работ. Абсталяванне плануецца закупіць у Кітаі. Яно досыць складанае, некаторыя вузлы трэба выпрацоўваць індывідуальна пад тэхнічныя параметры, закладзеныя ў заданні на праектаванне. У выніку запуску вытворчасці будзе створана 70 новых працоўных месцаў.

***— Якія мерапрыемствы фарміруюць культурны брэнд Талачыншчыны?***

— Талачынскі раён славіцца самабытнай культурай і нацыянальнымі, мястэчковымі традыцыямі і абрадамі. Кожны населены пункт адрозніваецца ад суседняга сваёй гісторыяй і асаблівасцямі ўкладу жыцця. Аграгарадок Слаўнае вядомы брэндавым святам «Жураві навы край», у Варанцэвічах праходзіць «Бульбяны разгуляй», пасёлак Райцы знакаміты фестывалем «У краі малочнага раздолля».

Паспяхова ў раёне рэалізуецца праект «Мая Спадчына», мэта якога — вывучэнне і захаванне духоўнай культуры, абрадаў, традыцый і гістарычнай памяці нашага народа.

У мэтах захавання ўзораў фальклорнай спадчыны ў раёне працуе этнаграфічная экспедыцыя «Жыватворная крыніца», якая дазваляе паглыбіцца ў нашы вытокі, зразумець, наколькі захаваны ў побыце ўзоры фальклору і як яны перадаюцца з пакалення ў пакаленне. Усяго за паўтара года работнікамі культуры было праведзена 44 такія экспедыцыі, іх вынікі стануць асновай зборніка «Мая Спадчына — мой Талачын».

Яшчэ адной адметнай асаблівасцю нашага рэгіёна, якой мы ганарымся, з'яўляецца адкрыты конкурс аматарскіх турыстычных фільмаў «Падарожнічаем па Сінявокай». Конкурс завяваў папулярнасць сярод турыстаў і падарожнікаў з розных куткоў Беларусі, Латвіі і Расіі. Дзякуючы шматлікім творчым работам удзельнікаў у беларусаў і замежных турыстаў значна павялічваецца цікавасць да вывучэння гісторыі нашай краіны, культуры і прыроды, прыцягваецца ўвага гасцей краіны да даследавання прыгожых месцаў і славутасцяў Беларусі. Сёлета конкурс збярэ ўдзельнікаў сёмы раз.

**Аляксандра ГВОЗДЗЕВА.**

**Фота «Витебские вести».**

# НА АПЕРАТАРА СПАДЗЯВАЙСЯ, АЛЕ І САМ НЕ ПАДДАВАЙСЯ!

## Зарабляеш грошы — клапаціся пра іх уладальнікаў

У Канстытуцыі сказана, што дзяржава стварае ўмовы для абароны персанальных даных, бяспекі асобы і грамадства пры іх выкарыстанні. Поспех у гарантаванні бяспечнага працэсу таго, што адбываецца з нашай асабістай інфармацыяй, залежыць не столькі ад дзяржавы (хоць без умоў належная абарона немагчымая), колькі ад дзеянняў арганізацый, якія збіраюць персанальную інфармацыю, і ад самога чалавека (наколькі ён сам цэніць тое, што характарызуе яго самога). А Нацыянальны цэнтр абароны персанальных даных (НЦАПД) створаны для таго, каб забяспечваць у краіне належнае выкананне прававых нормаў у забеспячэнні абароны ПД, дапамагаць вытрымліваць правы грамадзян людзям і арганізацыям, заўважыў **Андрэй ГАЕЎ, дырэктар НЦАПД,** які агучыў некалькі выпадкаў досыць буйных уцечак ПД (з гандлёвых сетак «Востраў чысціні і смаку» і «Буслік», а таксама сеткі салонаў сувязі «Ало»):

*— Зламыснікі скарысталіся ўразлівасцю сістэмы «Бітрыкс», змаглі ўкараніцца ў інфармацыйныя рэсурсы арганізацый і спампаваць звесткі пра кліентаў і работнікаў гэтых арганізацый. Аналіз сітуацыі паказаў, што ўцечкам папярэднічала непрыняцце мер па абароне інфармацыі, то-бок не абнаўляліся своечасова праграмныя прадукты. Асобы, якія павінны былі ажыццяўляць кантроль за абаронай інфармацыі, не выканалі неабходныя меры, прадугледжаныя заканадаўствам. Такім чынам, інфармацыйныя сістэмы не мелі належнай абароны з тэхнічнага боку. Аднак гэта вынік, а чаму так адбылося? Ніхто, акрамя саміх спецыялістаў арганізацый, не мог належным чынам забяспечыць абарону ПД грамадзян. Па сутнасці, бізнес, зарабляючы грошы на аказанні паслуг пры продажы тавараў, павінен клапаціцца пра тых, хто гэтыя грошы ім прыносіць.*

За апошні год Цэнтр праманіторыў звыш 50 сайтаў розных арганізацый, робячы акцэнт на буйныя асацыяцыі, якія прадстаўляюць розныя напрамкі бізнесу. А ў 2023-м (праведзена восем планавых праверак, пяць — пазапланавых і 15 — камеральных) выбудавалася работа з канкрэтнымі рэсурсамі і арганізацыямі, найперш тымі, хто гандлюе таварамі праз інтэрнэт. На жаль, у кожным выпадку выяўляліся парушэнні, удакладніў дырэктар, але ж прывесці прыклады такіх парушальнікаў нельга, бо гэта аўтаматычна стане падставай для зламыснікаў узламаць гэтыя неабароненыя сістэмы.

*— Нядаўна мы прааналізавалі буйны інфармацыйны рэсурс, і аказалася, што нават на абароненых хостынг інфармацыя аб сотнях тысяч нашых грамадзян не была*




*перанесена, ніякія меры, звязаныя з тэхнічнай абаронай інфармацыі, не выкананы, ніводнага варыянта лагіравання дзеянняў супрацоўнікаў не рабілася (хто і што робіць з ПД, нават немагчыма было выявіць),* — канстатаваў Андрэй Гаеў. — *З такімі арганізацыямі праводзіцца індывідуальная работа, вызначаюцца строгія графікі, што дакладна павінна зрабіць кампанія, каб наладзіць нармальную работу. Гэта датычыцца арганізацыйных мер: прызначэння адказных асоб за ўнутраны кантроль па апрацоўцы ПД, наладжвання доступу да асабістых звестак канкрэтных асоб арганізацый, а таксама тэхнічных мер, рэалізацыя якіх садзейнічае забеспячэнню патрэбнай абароны інфармацыі аб людзях.*

## Вучнёўская картка, білет на канцэрт, пасылка з падарункам

Парушэнні работы з ПД назіраюцца і ў іншых сферах. Напрыклад, часта збіраецца залішняя інфармацыя пра школьнікаў у рамках стварэння вучнёўскай карткі. Ва ўзаемадзеянні з адным з банкаў цэнтр сочыць за выдаленнем празмерных звестак пра больш як 200 тысяч непаўналетніх, падкрэсліў дырэктар:

*— Гэта звесткі з дакументаў, якія сведчаць асобу, інфармацыя пра месца жыхарства і шэраг іншых падобных даных, якія непатрэбныя для выдачы вучнёўскай карткі. Сёлета ў выніку прафілактычных мерапрыемстваў з сеціва выдалена больш 100 тысяч унікальных запісаў аб беларусах, якія былі распаўсюджаны раней без пэўных на тое падстаў. Пры гэтым больш за 1000 запісаў — гэта звесткі пра супрацоўнікаў МУС, якія былі змешчаны ў замежным сегменце інтэрнэту. Як паказала практыка, такімі запісамі паспяхова карыстаюцца зладзеі, якія рассылаюць шкодныя праграмы, займаюцца вішынгам і фішынгам.*

Сочаць у цэнтры і за лёсам выдаленых з інтэрнэту пакетаў даных, таму што зламыснікі маюць тэндэнцыю перыядычна выкладваць ліквідаваныя з сеціва ў выніку праверак звесткі нанова. Напрыклад, летась тройчы (!) выдаляліся з інтэрнэту звесткі пра беларусаў і расіян з базы кур'ерскай службы СДЭК, аднак і сёлета гэтыя базы зноў прыходзіцца выдаляць з сеціва. Пашпартныя даныя больш як 1200 чалавек трапілі ў сеціва пасля таго як людзі, калі здавалі білеты на канцэрт, далі арганізатарам копіі сваіх пашпартоў. Такія звесткі ў пакупнікоў увогуле не мелі права прасіць, запэўнілі ў цэнтры.

Вынікі праверак з'яўляюцца прыкладам для іншых аператараў. Сёлета складзена ўжо больш за 40 пратаколаў за парушэнне заканадаўства. Узбуджана і крымінальная справа, падставай для якой стала скарга дзвюх беларусак на незаконнае распаўсюджванне іх ПД індывідуальным прадпрымальнікам на яго сайце ў інтэрнэце. Пры праверцы факта звароту цэнтр запатрабаваў выдаліць звесткі. А яшчэ высветлії, што прадпрымальнік займаўся незаконнай дзейнасцю ў сферы інфармацыйных тэхналогій і прапаноўваў паслугі ў сферы інтэрнэту. У выніку органы ўнутраных спраў узбудзілі крымінальную справу.

*— Шырокае распаўсюджванне атрымалі гісторыі аб прапановах грамадзянам атрымаць прызы рознага роду прызы ў абмен на аплату кур'ерскіх паслуг па іх дастаўцы ці атрыманні на пошце. Людзям паведамлялі пра гэта праз СМС ці званкі. Кошт атрымання прыза досыць шмат беларусаў аплаціў, але ж жаданага прыза ў пасылцы так і не атрымалі. Толькі тады некаторыя сталі думаць, адкуль увогуле іх персанальная інфармацыя ў арганізацыях, адкуль ім званілі,* — падзяліўся Андрэй Гаеў. — *У выніку праверкі цэнтра органы ўнутраных спраў склалі пратаколы, і правапарушальнікі па судзе былі прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці.*

## Няхай мяне навучаць

Вялікую ролю адыгрываюць прафілактычныя меры навучальнага характару самых розных форм: анлайн-марафоны, практыкумы, форумы, сустрэчы ў працоўных калектывах, якія ахапілі звыш 20 тысяч чалавек. Прафесійныя і практыкаарыентаваныя курсы павышэння кваліфікацыі па абароне ПД, тэхнічнай, крыптаграфічнай абароне інфармацыі за год прайшлі 2,5 тысячы слухачоў. Звыш 2,2 тысячы навучаліся ў рамках семінараў і вэбінараў, зладжаных НЦАПД.

Займацца павышэннем кваліфікацыі і самаадукацыяй, своечасова атрымліваць веды вельмі важна, бо часам гэта дазваляе не ашукацца, падкрэсліў дырэктар цэнтра:

*— Адна камерцыйная арганізацыя выбудавала сваю мадэль бізнесу на тым, што, аказваючы грамадзянам (у тым ліку і непаўналетнім) у прынцыпе карысную паслугу, манетызацыю бізнесу рабіла праз прадстаўленне кантэкстнай рэкламы. І грошы на рэалізацыю гэтай мадэлі арганізацыям ужо патрачаны. Аднак, каб рассылаць людзям рэкламу ў такой сітуацыі, неабходна іх персанальная згода, а вось пра гэта арганізатары бізнесу не падумалі. Такім чынам, атрымалася, што бізнес запушчаны, затраты панесены, а мадэль выбудавана няправільна.*

**Поспех у гарантаванні бяспечнага працэсу таго, што адбываецца з нашай асабістай інфармацыяй, залежыць не столькі ад дзяржавы (хоць без умоў належная абарона немагчымая), колькі ад дзеянняў арганізацый, якія збіраюць персанальную інфармацыю, і ад самога чалавека (наколькі ён сам цэніць тое, што характарызуе яго самога).**

Каб кожны мог знайсці адказы на пытанні, якія яго цікавяць, цэнтр стараецца актыўна даносіць звесткі пра сваю дзейнасць у сацыяльных сетках і месенджарах. Спецыялісты НЦАПД пастаянна працуюць над зместам навучальных праграм, удзяляючы ўвагу іх практычнай частцы, разгляду кейсаў з канкрэтнымі сітуацыямі, распрацоўваюць новыя вучэбныя праграмы. У прыватнасці, запушчана новая праграма па абязлічванні ПД, а ў аўдыторыях цэнтра профільныя спецыялісты будуць неўзабаве вучыцца кіраванню інфармацыйнай бяспекай у арганізацыях і прадухіленню ўцечак даных.

Сумесна з Інстытутам інфармацыйных тэхналогій Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі завяршаюцца пэўныя мерапрыемствы, і дзесьці ў лістападзе павінна пачацца навучанне ў рамках перападрыхтоўкі. Гэта будзе двухгадовае навучанне для асоб з вышэйшай адукацыяй, звязанае з атрыманнем сістэмных ведаў па пытаннях арганізацыі работы ў сферы абароны ПД.

**Ірына СІДАРОК, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Сугучча

# КНІГІ НАШЫХ ЗЕМЛЯКОЎ

## Ураджэнка Беларусі расказвае пра нашчадкаў Аляксандра Пушкіна

**У Маскве ў адукацыйным праекце «Берега» пабачыла свет папулярная публіцыстычная кніга ўраджэнкі Ваўкавыска расійскай пісьменніцы Ларысы ЧАРКАШЫНАЙ «России двинулись сыны»: Потомки Пушкина на защите Отечества».**

У багата ілюстраваным выданні даследчыца расказвае пра франтавікоў Вялікай Айчыннай вайны і Другой сусветнай вайны з кагорты нашчадкаў славутага паэта. Вось імёны: Аляксандр Калагрываў, Алег Калагрываў, Рыгор Пушкін, Барыс Пушкін, Сяргей Пушкін, Марына Данілеўская (Чалік), Аляксандр Данілеўскі, Сяргей Кліменка, Аляксандр Піснячэўскі, Георгій Уладзіміравіч Варанцоў-Вельямінаў, Георгій Міхайлавіч Варанцоў-Вельямінаў, Джордж Майкл Аляксандр Уэрнер, Дэвід Майкл Маўнтбетэн, 3-і маркіз Мілфорд Хейфен.

Рыгор Рыгоравіч Пушкін вызваляў Беларусь. Пасля вызвалення Ліды быў прызначаны намеснікам ваеннага каменданта горада. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны І і ІІ ступеняў, баявымі медалямі. У мірны час вельмі любіў прыязджаць у Беларусь, выступаў з расповедамі пра свайго знакамітага прадзеда ў Мінску, Лідзе, Гродне, Маладзечне, Магілёве... Дзяцінства ўдзельніка абароны пад Валакаламскам, камандзіра ўзвода сувязі 2-га Беларускага фронту Аляксандра Усеваладавіча Калагрывава прайшло ў Бабруйску. «Бабруйск! ... Маё дзяцінства! Я ўспамінаю яблыневыя сады, сярод якіх хаваюцца драўляныя хаткі, разліў Бярэзіны, руіны старажытнай крэпасці... Пра крэпасць хадзілі легенды... Як толькі ў лесе з'яўляліся першыя пралескі, мая маці брала нас з братам у Кісялевіцкі бор. Мы ішлі па Гогалеўскай вуліцы, узбоч квітнеючых садоў. Праходзілі могілкі. Адсюль пачыналіся палеткі...» — пісаў Аляксандр Калагрываў пра сваё беларускае дзяцінства. Яго родны брат — Алег Калагрываў, які таксама вырас у Беларусі, у Бабруйску, ваяваў пад Гдовам, Псковам, Порхавам, вызваляў Прыбалтыку. З Беларуссю звязаны і лёс прапраўнука паэта Сяргея Кліменкі...

Ларыса Андрэеўна Чаркашына часта наведваецца ў Беларусь, любіць падарожнічаць па розных беларускіх гарадах і мястэчках. Добра знаёмая з Віцебшчынай, Полацкам. Пушкіністка з'яўляецца аўтарам многіх кніг, прысвечаных розным аспектам жыцця і творчасці класіка сусветнай паэзіі.

**Сяргей ШЫЧКО.**

Разам

# АД МІНСКА ДА БРАЗІЛІА

## Як развіваецца беларуска-бразільскае супрацоўніцтва?

**Пасольства Бразіліі ў Беларусі правяло ў Мінску ўрачысты прыём з нагоды дзяржаўнага свята — Дня Незалежнасці.**

— Я палюбіў Беларусь усім сэрцам, — прызнаўся Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Федэратыўнай Рэспублікі Бразілія ў Беларусі Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія Клінгл. — На ўласным вопыце зразумеў, што акадэмічныя падыходы маюць сэнс толькі ў тым выпадку, калі яны наўпрост звязаныя з рэальнасцю, у якой жывуць нашы народы. Інакш кажучы, дыпламатыя толькі тады паспяховая, калі яна цвёрда стаіць на зямлі і імкнецца рэалізаваць нацыянальныя інтарэсы. Такая дыпламатыя грунтуецца на адносінах з рэальнымі людзьмі. Мы, дыпламаты, імкнёмся выканаць місію па пабудове адносін, якія прынеслі б узаемную выгаду нашым грамадствам. Для гэтага вельмі важна, каб мы лепш пазналі адзін аднаго. Таму я паставіў перад сабой задачу раскрыць Бразілію для Беларусі і расказаць сваім суайчыннікам, што я даведаўся пра вашу краіну. Большасць з нашых партнёраў і ёсць галоўныя героі гэтай гісторыі. Для мяне яны — сапраўднае аблічча дыпламатыі, усе тыя, хто робіць зносіны паміж народамі магчымымі».





Як адзначыў дыпламат, падарожнічаючы па нашай краіне, ён меў магчымасць стаць сведкам высокага тэхналагічнага развіцця і сур'ёзнай работы дзяржаўных і прыватных кампаній у розных сферах. «Я дагэтуль жыва ўспамінаю сваё наведванне калійных шахт у Салігорску, дзе я спускаўся на глыбіню 900 метраў і бачыў на свае вочы, дзе здабываюцца калійныя солі, якія ўваходзяць у склад угнаенняў, якія ўжо на працягу многіх гадоў выкарыстоўваюцца для вытворчасці прадуктаў харчавання, у тым ліку кавы, у Бразіліі, — падзяліўся пасол. — Мяне ўразіла работа «Беларуськалія» на карысць сацыяльнага развіцця рэгіёна».

Пасольства Бразіліі запрашала аднаго з вядучых бразільскіх спецыялістаў у галіне кавы наведаць Мінск. Была арганізавана прэзентацыя з дэгустацыяй кавы высокай якасці, у тым ліку прадставілі навінку — чай з кававых ягад. «Як вы ведаеце, Бразілія з'яўляецца найбуйнейшым у свеце вытворцам кавы, і прызнанне гэтага напою выходзіць за рамкі яго спажывання. Кава — гэта заўсёды нагода сустрэцца з сябрамі, пагутарыць. Мы рады, што наша мерапрыемства выклікала вялікую цікавасць. Мінск — гэта горад, дзе кожны дзень з'яўляюцца новыя дэгустацыйныя пляцоўкі, а прысутнасць бразільскай кавы яшчэ больш умацоўвае сувязь паміж нашымі народамі», — адзначыў Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія Клінгл.

Пасольства не спыняецца на дасягнутым. Як заўважыў кіраўнік дыпламатычнай місіі, «шукаем магчымасці для ўзаемнага гандлю рознай прадукцыяй, напрыклад, шакаладам, тэкстыльнымі вырабамі, трактарамі, велікагрузнымі аўтамабілямі. Мы імкнёмся да супрацоўніцтва ў пытанні ачысткі нашых рэк. У Беларусі ёсць кампанія з вялікім вопытам у гэтай галіне».

У культурнай сферы рэалізаваны праект, які ўжо стаў візітнай карткай супрацоўніцтва. «Ён нарадзіўся з ідэі выклікаць у беларусаў цікавасць да Бразіліі і заахвоціць іх выйсці за рамкі традыцыйных уяўленняў аб маёй краіне, якія склаліся ў тых, хто ніколі не бываў у Бразіліі. Праект атрымаў, на мой погляд, удалую назву — «Спатканне з Бразіліяй», — адзначыў Бернард Жорг Леапольд дэ Гарсія Клінгл. Гэтая выстава, акрамя сталіцы, таксама праходзіла ў Гродне і Віцебску і хутка будзе прадстаўлена на Лацінаамерыканскім фестывалі ў Мінску.

«Калі мы адзначаем гадавіну незалежнасці Бразіліі, то памятаем пра важнасць гарантаваць гэтую незалежнасць кожны дзень. Мы разумеем, што незалежнасць — гэта не проста фармальнае прызнанне нашага суверэнітэту, але гарантыя таго, што мы зможам рэалізаваць яго ў поўнай меры, — заўважыў пасол. — Мы хочам мець магчымасць паглыбляць наша супрацоўніцтва з вамі без якіх-небудзь умоў, без абмежаванняў і санкцый».

Пазіцыі Беларусі і Бразіліі супадаюць па найбольш вострых праблемах сучаснасці, уключаючы неабходнасць рэфармавання ААН і яе найважнейшых інстытутаў, барацьбу з міжнародным тэрарызмам, неабходнасць устанаўлення справядлівага міжнароднага эканамічнага парадку. Гэта адзначыў намеснік міністра замежных спраў Яўген Шастакоў. «У Беларусі з Бразіліяй склаліся канструктыўныя адносіны, заснаваныя на ўзаемнай павазе і ўліку нацыянальных інтарэсаў нашых краін, якія дазваляюць нам плённа весці міждзяржаўны дыялог, развіваць гандлёва-эканамічнае супрацоўніцтва, умацоўваць сувязі ў сферы культуры і адукацыі, — падкрэсліў Яўген Шастакоў. — Мы высока ацэньваем ролю Бразіліі ў БРІКС на фоне фарміравання новага шматпалярнага свету. Беларусь разлічвае стаць членам гэтай аўтарытэтнай міжнароднай структуры, што яшчэ больш будзе садзейнічаць умацаванню нашага супрацоўніцтва».

Наша краіна гатова да актыўнага ўзаемадзеяння на ўсіх узроўнях палітычнага супрацоўніцтва з Бразіліяй, што было нядаўна пацверджана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь Аляксандрам Лукашэнкам, адзначыў Яўген Шастакоў. «Нашы адносіны можна смела назваць вуліцай з двухбаковым рухам. У сувязі з гэтым вельмі важна захаваць гэтыя адносіны ва ўмовах бягучай геапалітычнай нестабільнасці. Лічу, што нам гэта ўдаецца. Пра гэта сведчыць актывізацыя палітычных кантактаў і паступовае аднаўленне эканамічных паказчыкаў беларуска-бразільскага супрацоўніцтва. Калі летась тавараабарот паміж нашымі краінамі склаў 358 мільёнаў долараў, то сёлета толькі за студзень — ліпень аб'ём двухбаковага гандлю ўжо дасягнуў амаль 480 мільёнаў».

Традыцыйна вялікую долю ў двухбаковым гандлі займаюць пастаўкі калійных угнаенняў. «Нягледзячы на дзеючыя санкцыі і абмежаванні, дзякуючы сумесным намаганням мы аднаўляем пастаўкі гэтай вельмі запатрабаванай на бразільскім рынку беларускай прадукцыі. Разам з тым мы разлічваем на пашырэнне ўзаемадзеяння па іншых напрамках: Беларусь можа забяспечыць пастаўку цэлага шэрагу ключавых гандлёвых пазіцый, што імпартуюцца Бразіліяй, такіх як нафтапрадукты, азотныя і змешаныя ўгнаенні, кордныя матэрыялы і шыны, кар'ерныя самазвалы, беспілотныя апараты верталётнага тыпу і інтэлектуальнае кропкавае земляробства для аграрнага сектара, электрычны транспарт і шырокая гама тавараў нафтахімічнага комплексу, — заявіў намеснік міністра замежных спраў. — Беларусь ужо прапаноўвае на разгляд бразільскім партнёрам эфектыўныя рашэнні па забеспячэнні малымі трактарамі прыватных фермераў і сямейных фермерскіх гаспадарак Бразіліі з улікам патрабаванняў бразільскага заканадаўства па лакалізацыі вытворчасці».

Павіншаваць бразільскіх сяброў з дзяржаўным святам прыйшлі не толькі работнікі беларускага знешнепалітычнага ведамства і іншых міністэрстваў, прадпрыемстваў, але і калегі з дыпламатычных прадстаўніцтваў шэрагу дзяржаў, парламентары Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі нашай краіны, журналісты, студэнты. Дзякуючы выдатнаму джаз-бэнду, урачыстасць праходзіла пад акампанемент шыкоўнай басановы. Але не толькі. У якасці разынкі — дыджэйскія сэты ў гарачых бразільскіх матывах. Сапраўдная экзотыка для восеньскага Мінска.

**Мікалай ЛІТВІНАЎ.**

**Фота прадастаўлена пасольствам Бразіліі.**

### Даслоўна

### «ВЯЛІКІ ПАТЭНЦЫЯЛ ПАГЛЫБЛЕННЯ АДНОСІН»

Беларусь нязменна прыхільная да добразычлівага двухбаковага партнёрства з Бразіліяй, адзначыў у віншаванні з Днём Незалежнасці кіраўніку гэтай краіны Луісу Інасіу Лулу да Сілва Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. «Пад вашым кіраўніцтвам краіна ўпэўнена рухаецца наперад па шляху эканамічнага і сацыяльнага развіцця, эфектыўна адстойвае свае інтарэсы на міжнароднай арэне, пацвярджаючы статус адной з найбольш уплывовых дзяржаў, з меркаваннем якой павінны лічыцца», — адзначаецца ў віншаванні.

«Мы арыентаваны на пошук новых магчымасцяў для супрацоўніцтва на фоне трансфармацыі сусветнага парадку ў бок шматпалярнасці і справядлівасці, — падкрэсліў беларускі лідар. — Лічу, што наяўнасць сумесных інтарэсаў і ўзаемнай палітычнай волі абумоўлівае вялікі патэнцыял паглыблення адносін нашых дзяржаў па самым шырокім коле напрамкаў».

Аляксандр Лукашэнка пажадаў Луісу Інасіу Лулу да Сілву выдатнага здароўя, невычэрпнай жыццёвай энергіі і яшчэ больш амбіцыйных планаў, а народу Бразіліі — адзінства і светлай будучыні.

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Кошт арэнды пакоя ў Лондане ўстанавіў гістарычны рэкорд




Сярэдняя цана за арэнду пакоя ў Лондане ўпершыню ў гісторыі пераадолела адзнаку ў тысячу фунтаў стэрлінгаў ($1,25 тыс.) у месяц, паводле даных сайта SpareRoom, на якім людзі шукаюць суседзяў для сумеснага здыму жылля. У жніўні пакоі ў брытанскай сталіцы падаражэлі на 15 працэнтаў у гадавым вылічэнні. Рост удвая апярэдзіў інфляцыю ў краіне. Сярэдні кошт арэнды пакоя ў цэлым па краіне складае 794 фунты за месяц, што таксама з'яўляецца новым гістарычным максімумам. Рост ставак арэнды ў Вялікабрытаніі выкліканы дэфіцытам прапановы, паколькі многія гаспадары жылля, раней якія здавалі яго, цяпер прадаюць сваю ўласнасць на фоне ўзлёту цэн на нерухомасць. Між тым попыт на пакоі вырас з-за высокай інфляцыі, якая прымусіла многіх нізкааплатных супрацоўнікаў, якія працуюць у Лондане, шукаць шляхі для эканоміі. Кіраўнік Банка Англіі Эндру Бейлі, які днямі выступаў у парламенце, выказаў апасенні з прычыны ўплыву росту ставак на рынак арэнды жылля, і асабліва на самы бюджэтны яго сегмент. Элізабэт Стымен, якая адказвае за фінансавую палітыку ў Банку Англіі, прызналася, што чатыры пакаленні яе сям'і жывуць разам, таму што «для моладзі становіцца ўсё больш цяжкай задачай знайсці жыллё, якое яны могуць сабе дазволіць».

### У Германіі зафіксавалі максімальную з 1950-х колькасць бежанцаў



Колькасць бежанцаў, якія пражываюць у Германіі, дасягнула новага максімуму і перавысіла тры мільёны чалавек, паведаміла нямецкая служба навін Tagesschau. Паводле даных МУС Германіі, усяго ў канцы чэрвеня ў якасці бежанцаў у краіне было зарэгістравана 3,26 мільёна чалавек, што на 111 тысяч больш, чым шасцю месяцамі раней. Згодна з інфармацыяй Левай партыі, якая рабіла ў МУС адпаведны запыт, гэта найвышэйшы паказчык з 1950-х гадоў. Адзначаецца, што многія бежанцы жывуць у Германіі гадамі ці дзесяцігоддзямі.

Пры гэтым колькасць бежанцаў з Украіны за паўгода ўзрасла нязначна — прыкладна на 29 тысяч чалавек і перавысіла мільён. Таксама адзначаецца, што каля 279 тысяч чалавек загадана пакінуць краіну.

### На Ганконг абрынулася наймацнейшая за 140 гадоў залева



Па меншай меры 110 чалавек пацярпелі і былі дастаўлены ў бальніцы ў выніку наймацнейшай залевы, якая абрынулася на Ганконг. Аб гэтым паведаміла газета South China Morning Post. Адзначаецца, што экстрэмальная з'ява надвор'я ператварыла вуліцы ў рэкі, затапіла гандлёвыя цэнтры і чыгуначныя станцыі. Улады Ганконга адмянілі заняткі ў школах і заклікалі работадаўцаў увесці для супрацоўнікаў гнуткі працоўны графік. У Дэпартамент пажарнай службы Ганконга паступіла больш за 340 зваротаў па дапамогу ў сувязі з паводкай. Было адкрыта 15 часовых прытулкаў, у якіх пасяліліся па меншай меры 325 чалавек. У Метэаралагічнай абсерваторыі Ганконга паведамілі, што выпала больш за 600 міліметраў ападкаў, што складае чвэрць ад агульнага гадавога ўзроўню. Раней абсерваторыя абвясціла найвышэйшае, чорнае, штармавое папярэджанне з-за наймацнейшага за ўсю гісторыю назіранняў (з 1884 года) лівня.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Организатор аукциона:** ООО «ИПМ-Консалт оценка»,
г. Минск, ул. Мележа, 5, корп. 2, пом. 1703

**Продавец:** ОАО завод «ВИЗАС»,
210602, г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83

**Оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83**

| № лот | Инв. номер | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Перечень 1 (снижение начальной стоимости на 95 %)** | | | | |
| 1. | 3692 | Система вентиляции | 1236,00 | 61,80 |
| **Перечень 2 (снижение начальной стоимости на 95 %)** | | | | |
| 2. | 106 | ЛИТФОРМА 1835-4029 ТИП 20 | 342,00 | 17,10 |
| 3. | 2892 | Швейная машина ПШМ КЛ.550 | 20,40 | 1,02 |
| 4. | 2895 | Швейная машина ПШМ КЛ.1022М | 20,40 | 1,02 |
| 5. | 2927 | Полуавтомат специально-заточной для дисков пил ВЗ-330 | 2 118,00 | 105,90 |
| 6. | 3698 | Модернизация вальцев резинообр. ЛБ-200 100/100 | 3678.00 | 183.90 |
| 7. | 3009 | Воздухонагреватель ВГС-1 и его составляющие | 3 354,00 | 167,70 |
| 8. | 3010 | Воздухонагреватель ВГС-1 и его составляющие | 3 354,00 | 167,70 |
| 9. | 3011 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 3 462,00 | 173,10 |
| 10. | 3012 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 3 462,00 | 173,10 |
| 11. | 3013 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 3 462,00 | 173,10 |
| 12. | 3014 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 3 462,00 | 173,10 |
| 13. | 3015 | Воздухонагреватель ВГС-1-01 и его составляющие | 3 462,00 | 173,10 |
| 14. | 1358 | Станок координатно-расточной BKZ900x14* | 15 240,00 | 762,00 |
| 15. | 2295 | Станок координатно-сверлильный с ЧПУ VR-5M-2295 | 42 960,00 | 2 148,00 |
| 16. | 3797 | Мод-я станка для деревообр. инструмента ТЧП-4 | 2 502,00 | 125,10 |
| 17. | 3801 | Стенд для испытания БИД (модернизация) | 3 624,00 | 181,20 |
| 18. | 3803 | Стенд для обкатки СДО-2 | 474,00 | 23,70 |
| 19. | 3807 | Полуавтомат для заточки зуборезных головок ВЗ-685Ф2 | 45 600,00 | 2 280,00 |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Перечень 3 (снижение начальной стоимости 90 %)** | | | | |
| **Оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83** | | | | |
| 20. | 687 | Эстакада для выпрямителей ВАКГ-3200 | 6,00 | 0,30 |
| 21. | | Комплект спецподдонов ЗМА-275 (в количестве 14 ед.). Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by в разделе «Документы». | 7,20 | 0,36 |
| 22. | 8400 | Оптиметр ИКГ-3 | 360,00 | 18,00 |
| 23. | 1697 | Печь ОКБ 8084 | 4200,00 | 210,00 |
| 24. | 3630 | Водонагреватель Нева-3208-02 | 10,80 | 0,54 |
| 25. | 3631 | Водонагреватель Нева-3208-02 | 10,80 | 0,54 |
| 26. | 3680 | Модернизация устройства МТП-318 (Н481) | 1524,00 | 76,20 |
| 27. | 8178 | Ризограф CR1610EP | 33,60 | 1,68 |
| 28. | 3032 | Стенд д/исп. фрез ЗМА-376 | 840,00 | 42,00 |
| 29. | 3063 | Профилограф 253 | 33,60 | 1,68 |
| 30. | 371 | Стол СТ-9 к микроскопу СТ-9 | 768,00 | 38,40 |
| 31. | 373 | Универсальный микроскоп УИМ-21 | 1284,00 | 64,20 |
| 32. | 3760 | Измерительная машина специальная СТ-4.10 | 2628,00 | 131,40 |
| 33. | 389 | Профилограф 253 | 30,00 | 1,50 |
| 34. | 50 | Станок ВЗ-389 | 636,00 | 31,80 |
| 35. | 421 | Микроскоп ДИП-1 | 1284,00 | 64,20 |
| 36. | 425 | Уровень электронный А12 | 264,00 | 13,20 |
| 37. | 437 | Шумомер ВШВ | 111,60 | 5,58 |
| 38. | 3067 | Шумомер ВШВ | 111,60 | 5,58 |
| 39. | 440 | Уровень электронный | 132,00 | 6,60 |
| 40. | 7249 | Прибор для проверки червячных фрез КЭФ-270 | 2916,00 | 145,80 |
| 41. | 491 | Микроскоп металлографический ММП-2П | 45,60 | 2,28 |
| 42. | 494 | Микроскоп металлографический ММП-2 | 45,60 | 2,28 |
| 43. | 497 | Стилоскоп «Спектр» | 144,00 | 7,20 |
| 44. | 3060 | Стилоскоп «Спектр» | 144,00 | 7,20 |
| 45. | 499 | Микроскоп МБС-10 | 75,60 | 3,78 |
| 46. | 3121 | Центрифуга | 44,40 | 2,22 |
| 47. | 3122 | Центрифуга | 44,40 | 2,22 |
| 48. | 3681 | Наладка РШ-01 к станку ВЗ-580Ф4 | 11988,00 | 599,40 |
| **Перечень 4 (снижение начальной стоимости на 90 %) Готовая продукция, расположенная по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83** | | | | |
| 49. | | Приспособление для цилиндрической заточки сверл ВЗ-879-02 П2 (в количестве 2 ед.). Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by. | 180,00 | 9,00 |
| 50. | | Станок для закругления режущих кромок зубов твердосплавных пил ВЗ-478 (в количестве 4 ед.). Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by | 300,00 | 15,00 |
| 51. | 3 | Контрольно-измерительное устройство ВЗ-681 | 1056,00 | 52,80 |
| 52. | 2 | Контрольно-измерительное устройство ВЗ-681 | 1056,00 | 52,80 |
| 53. | 1 | Контрольно-измерительное устройство ВЗ-681 | 1056,00 | 52,80 |
| 54. | 6 | Контрольно-измерительное устройство ВЗ-682 1Ф (в количестве 10 ед.). Перечень с инв. номерами размещен на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by. | 720,00 | 36,00 |
| 55. | 4 | Приспособление для заточки пил (d=160-500 мм) ВЗ-879-02 П1 | 396,00 | 19,80 |
| 56. | 4 | Приспособление для заточки пил вертикальных лесопильных рам ВЗ-879-02 П3 (L=1250-1950 мм) | 360,00 | 18,00 |
| 57. | 3 | Приспособление для заточки пил вертикальных лесопильных рам ВЗ-879-02 П3 (L=1250-1950 мм) | 360,00 | 18,00 |
| 58. | 5 | Приспособление для заточки пил вертикальных лесопильных рам ВЗ-879-02 П3 (L=1250-1950 мм) | 360,00 | 18,00 |
| 59. | 1 | Устройство измерительное для контроля зуборезных головок ВЗ-671 | 2376,00 | 118,80 |

**Перечень 5 – незавершенные производством станки, узлы станков, детали и элементы, расположенные по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83 (снижение начальной стоимости на 90 %)**

| № лот | Наименование | Готовность, % | Кол-во | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| 60. | Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (2 кожуха, станина и КД) | 90 | 1 | 2344,20 | 117,21 |
| 61. | Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (кожух, станина и КД) | 70 | 1 | 1823,28 | 91,16 |
| 62. | Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (кожух, станина и КД) | 70 | 1 | 1823,28 | 91,16 |
| 63. | Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (кожух, станина и КД) | 70 | 1 | 1823,28 | 91,16 |
| 64. | Стенд для испытания шлифовальных кругов на разрыв вращением СР-400В (комплект деталей) | 50 | 6 | 7814,16 | 390,71 |
| 65. | Станок заточной для сверл (d=0,4-3,0 мм, настольный) ВЗ-889 (комплект деталей) | 50 | 1 | 793,44 | 39,67 |
| 66. | Станок заточной для сверл (d=0,4-3,0 мм, настольный) ВЗ-889 (комплект деталей) | 50 | 1 | 793,44 | 39,67 |
| 67. | Станок заточной для сверл (d=0,4-3,0 мм, настольный) ВЗ-889 (комплект деталей) | 50 | 1 | 793,44 | 39,67 |
| 68. | Станок заточной для сверл (d=0,4-3,0 мм, настольный) ВЗ-889 (комплект деталей) | 50 | 1 | 793,44 | 39,67 |
| 69. | Станок точильно-шлифовальный (с пылесосом, круг d=350 мм) ВЗ 879-01 (без электродвигателя) | 90 | 1 | 611,04 | 30,55 |
| 70. | Станок точильно-шлифовальный (с пылесосом, круг d=350 мм) ВЗ 879-01 (без электродвигателя) | 90 | 1 | 611,04 | 30,55 |
| 71. | Присп. для заточки диск. пил (d=200-450мм) по торцу зубьев ВЗ 318 П 56 (комплект деталей) | 2 | 5 | 109,20 | 5,46 |
| 72. | Станок для заточки плоских ножей (с поворотным столом) ВЗ-874 (комплект деталей) | 40 | 5 | 1420,20 | 71,01 |

**Перечень 6 (снижение начальной стоимости на 95 %) Оборудование, бывшее в употреблении, расположенное по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83**

| № лот | Наименование | Инв. номер | Начальная цена с НДС 20 %, бел.руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 73. | Литформа 1835-4029 Тип 20 | 914 | 30,00 | 1,50 |
| 74. | Для снятия фасок НО-368 | 2459 | 90,00 | 4,50 |
| 75. | ПЭВМ POWER INTEL G860 | 1399 | 12,00 | 0,60 |
| 76. | ПЭВМ «POWER» ПРОЦЕССОР INTEL PENTIUM G2120 | 1401 | 12,00 | 0,60 |
| 77. | КОМПЬЮТЕР ПЭВМ MAX SELECT | 29 | 12,00 | 0,60 |
| 78. | КОМПЬЮТЕР ПЭВМ MAX SELECT | 30 | 12,00 | 0,60 |
| 79. | Компьютер | 3600 | 12,00 | 0,60 |
| 80. | Компьютер | 3612 | 12,00 | 0,60 |
| 81. | Компьютер ICS Cel | 3629 | 12,00 | 0,60 |
| 82. | Компьютер ICS Cel | 3633 | 12,00 | 0,60 |
| 83. | Принтер Printronix P7005 500 | 3677 | 60,00 | 3,00 |
| 84. | Компьютер TOWER 1800 | 3688 | 12,00 | 0,60 |
| 85. | Компьютер ПЭВМ IL GEMINI AMP | 3768 | 12,00 | 0,60 |
| 86. | Компьютер 10С 743-3 ПЭВМ Gemini | 3784 | 12,00 | 0,60 |
| 87. | Компьютер 10С839-3 ПЭВМ GEMINI | 3808 | 12,00 | 0,60 |
| 88. | ПЭВМ «N-TECH-I-X» | 3908 | 21,00 | 1,05 |
| 89. | ПЭВМ «ICS» P4. МОНИТОР 19 | 65 | 15,00 | 0,75 |
| 90. | Принтер HP LJ 1100C | 8156 | 9,00 | 0,45 |
| 91. | Принтер Canon LBP-810 | 8230 | 9,00 | 0,45 |
| 92. | Принтер Canon LBP-1120 | 8238 | 9,00 | 0,45 |

**Перечень 7 – имущество, расположенное по адресу: г. Витебск, пр-т Фрунзе, 83**

| № лот | Наименование | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. | Шаг аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 93. | **Распиловочный участок ДОЦ** (Здание специализированное для производства машин и оборудования (машиностроения), общей площадью 1391,9 кв. м, инв. номер 200/С-502563 | 71 520,00 (снижение на 80 %) | 3 576,00 |

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 240100000001005466:** предоставлен на праве аренды по 03.04.2068 (доля 999/1000) общей площадью 10,4867 га для содержания и обслуживания административно-производственных зданий и сооружений

**Перечень 8 – лот 94: имущество, реализуемое одним лотом, по адресу: Витебская обл., г. Витебск, пр-т Фрунзе, д. 83**

| Наименование (назначение), инвентарный номер | Общ. пл., кв. м |
|---|---|
| **Административно-бытовой корпус № 1** (здание административно-хозяйственное), инв. номер 200/С-61161 | 7582,7 |
| **Административно-бытовой корпус № 3** (здание административно-хозяйственное), инв. номер 200/С-61160 | 3568,7 |
| **Производственное помещение** (производственное помещение), инв. номер 200/D-175256 | 44519,1 |
| **Автостоянка** (сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства), инв. номер 200/С-501697 | 1387,1 |
| **Внеплощадочные кабельные сети** (сооружение специализированное энергетики), инв. номер 200/С-500509 | 1260 |
| **Тепловые сети** (сооружение специализированное коммунального хозяйства), инв. номер 200/С-500510 | 70,5 |
| **Благоустройство территории** (сооружение благоустройства), инв. номер 200/С-502429 | 25477,3 |

**Кабельные сети** (сооружение специализированное энергетики): инв. номер 200/С-501645 (общ. пл. 176,9 кв. м), инв. номер 200/С-501646 (общ. пл. 135,7 кв. м), инв. номер 200/С-501647 (общ. пл. 242 кв. м), инв. номер 200/С-501648 (общ. пл. 23,7 кв. м), инв. номер 200/С-501649 (общ. пл. 151,9 кв. м), инв. номер 200/С-501650 (общ. пл. 153,9 кв. м), инв. номер 200/С-501652 (общ. пл. 75,9 кв. м), инв. номер 200/С-501653 (общ. пл. 131,7 кв. м), инв. номер 200/С-501655 (общ. пл. 177,7 кв. м), инв. номер 200/С-501662 (общ. пл. 84,4 кв. м)

**В состав лота входит иное имущество (в кол-ве 91 ед.).** Подробный список размещен на сайте организатора аукциона **www.ipmtorgi.by**

| | |
|---|---|
| **Начальная цена с НДС 20 %** | **6 457 021,20 бел. руб. (снижение стоимости на 30 %)** |
| **Шаг аукциона** | **322 851,06 бел. руб.** |
| **Обременения** | **Аренда.** Подробная информация у Продавца |

**Сведения о земельном участке с кадастровым номером 240100000001005466:** предоставлен на праве аренды по 03.04.2068 (доля 999/1000) общей площадью 10,4867 га для содержания и обслуживания административно-производственных зданий и сооружений.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 19.08.2023 г.

| | |
|---|---|
| **Дата, место и время проведения аукциона** | **28.09.2023** в 13.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |
| **Дата, место и время окончания приема документов** | **25.09.2023** до 17.00 по адресу: **г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ООО «ИПМ-Консалт оценка»** |

**Порядок ознакомления:** осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Лебедев Александр Павлович, тел. 8029-515-38-19

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона стоимостью **до 50 000 бел. руб.,** и **1 %** от начальной цены предмета аукциона стоимостью **свыше 50 000 бел. руб.** в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа – ООО «ИПМ-Консалт оценка»

**Срок подписания договора купли-продажи: 10** (десять) рабочих дней после проведения аукциона

**Срок оплаты:**
**1. Лоты стоимостью до 50 000** не более 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.
**2. Лоты стоимостью свыше 50 000** не более 30 (тридцати) дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи

**Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов:** аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением Совмина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона **www.cpo.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику, по начальной цене, увеличенной на 5 %

**Затраты** и вознаграждение (от 1 % до 8 %) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи, в течение 5 дней со дня проведения торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ НЕДВИЖИМОГО ИМУЩЕСТВА

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении электронных торгов № **2023.Ч.002.00085** по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by

**Продавец:** Открытое акционерное общество «Доломит», 210012, г. Витебск, ул. Центральная, 23, тел. 8 (0212) 69-19-49.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов: 28.09.2023 в 09.00** (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Изолированное помещение с инв. № 200/D-103425 площадью 263,7 кв. м, наименование – торговое помещение, назначение – торговое помещение по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, 16-3. Система пожарной сигнализации и оповещения людей о пожаре в торговом помещении (инв. № 63027) по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, 16-3.

**Обременения**: договора аренды от 01.06.2009 № 191 и от 02.03.2020 № 277 со сроком действия по 03.03.2024, а в случае отчуждения изолированного помещения – до перехода права собственности на указанное изолированное помещение; договор аренды от 30.12.2011 № 230 сроком действия по 31.12.2027, а в случае отчуждения изолированного помещения – до перехода права собственности на указанное изолированное помещение, договор аренды от 01.10.2021 № 282 сроком действия по 30.09.2024, а в случае отчуждения изолированного помещения – до перехода права собственности на указанное изолированное помещение.

**Нач. цена:** 94 920,00 бел. руб. с учетом НДС 20 %.

**Задаток:** 9492,00 бел. руб.

Объект находится на земельном участке с кадастровым номером 240155400001000168 площадью 0,2016 га по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. Центральная, 16 (общая долевое право аренды).

Электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом организации и проведения электронных торгов по продаже имущества и имущественных прав на электронной торговой площадке коммунального консалтингового унитарного предприятия «Витебский областной центр маркетинга» «etpvit.by».

**Для участия в повторных электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП.

**Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 27.09.2023. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566, код операции 40901. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга».

**Условия повторных электронных торгов:** Победитель эл. торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 10 (десяти) раб. дней с даты проведения электронных торгов возместить затраты на организацию и проведение электронных торгов, расходы Продавца на проведение независимой оценки и оплатить услуги Оператора ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; подписать договор купли-продажи предмета электронных торгов в течение 11 (одиннадцати) рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядки и сроки, установленные договором купли-продажи. *Расходы Продавца на проведение независимой оценки составляют 864,64 бел. руб. в т. ч. НДС 20 %*. С подробной информацией о предмете электронных торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Организатор электронных торгов имеет право отказаться от проведения электронных торгов в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до наступления даты проведения торгов. Ознакомиться с предметом электронных торгов можно в рабочие дни с 09.00 до 16.00 по предварительному согласованию с Продавцом по тел.: Прудников Руслан Александрович +375 (33) 346-04-61.

Сацыяльны ракурс

# ПРЭСТЫЖ НАСТАЎНІЦКАЙ ПРАФЕСІІ — НЕ ПУСТЫЯ СЛОВЫ

## Размова ідзе пра грамадскае прызнанне важнасці адукацыі

**Сацыяльная падтрымка настаўнікаў, якасць падрыхтоўкі кадраў для адукацыйнай галіны і павышэнне статусу педагога ў грамадстве — гэтыя і многія іншыя пытанні аказаліся ў цэнтры ўвагі ўдзельнікаў VII з'езда Міжнароднага аб'яднання прафсаюзаў работнікаў адукацыі і навукі, які прайшоў у беларускай сталіцы. Дэлегаты прадстаўлялі восем галіновых прафсаюзаў з сямі краін СНД, якія аб'ядноўваюць у сваіх шэрагах 2,5 мільёна работнікаў сістэмы адукацыі. З папярэдняга з'езду прайшло пяць гадоў...**




### Пандэмія і санкцыі

— ...Яны былі напоўнены знакавымі падзеямі. І калі 2018—2019 гады можна ахарактарызаваць як адносна стабільныя, то пандэмія, якая ахапіла планету ў 2020 годзе, рэзка ўдарыла па ўсіх, у многім абясцэніўшы дасягненні апошніх гадоў, — падкрэсліла ў сваім выступленні на з'ездзе **старшыня Міжнароднага аб'яднання прафсаюзаў работнікаў адукацыі і навукі Галіна МЯРКУЛАВА** (яна таксама ўзначальвае Агульнарасійскі прафсаюз адукацыі). — У большасці краін нашага рэгіёна назіраецца замаруджванне тэмпаў эканамічнага росту, становішча ў эканоміцы ўскладняецца беспрэцэдэнтнымі санкцыямі Захаду супраць Расіі і Беларусі і мерамі ў адказ з нашага боку. Усё гэта моцна ўскладніла дзейнасць прафсаюзаў, але не змагло заблакіраваць барацьбу за правы і інтарэсы людзей працы.

Трэба канстатаваць, што нацыянальныя ўрады не без уплыву на іх галіновых прафсаюзаў — членаў нашага аб'яднання — не адмаўляюцца ад сваіх абавязкаў па падтрыманні сацыяльнага статусу педагагічных работнікаў. Адбыліся сур'ёзныя змяненні ва ўмовах працы работнікаў адукацыі, каталізатарам якіх сталі пандэмія і паскорная лічбавізацыя. Аддадзім належнае: у гэты час былі ажыццёўлены буйнамаштабныя меры па арганізацыі работы на дыстанцыі і забеспячэнні навучальных устаноў і педагагічных работнікаў неабходным абсталяваннем і праграмным забеспячэннем. Гэта быў вельмі няпросты перыяд, да яго аказаліся непадрыхтаваныя і настаўнікі, і бацькі вучняў.

Членскія арганізацыі Міжнароднага аб'яднання прафсаюзаў работнікаў адукацыі і навукі актыўна ўдзельнічалі ў распрацоўцы і рэалізацыі нацыянальных праграм занятасці і перападрыхтоўкі кадраў, настойвалі на скарачэнні нефармальнай занятасці, клапаціліся пра абарону ад беспрацоўя. Паслядоўна дабіваліся павышэння аплаты працы сваіх работнікаў. Мы рашуча выступаем супраць спроб рэвізіі працоўнага заканадаўства ў некаторых краінах Садружнасці. У полі нашага зроку пастаянна знаходзіўся ўвесь комплекс пытанняў сацыяльнай палітыкі, аховы працы, здароўя работнікаў, пенсіённага і сацыяльнага забеспячэння работнікаў.

Паводле слоў Галіны Мяркулавай, для ўсіх краін рэгіёна захоўваюцца агульныя праблемы, такія як недасканаласць заканадаўства, нарматыўных актаў у галіне аховы працы, недастатковае веданне прафесійных рызык, адсутнасць матывацыі ў работадаўцаў па паляпшэнні ўмоў працы работнікаў. Ёсць факты, калі няшчасныя выпадкі, што здарыліся з работнікамі, хаваюцца ў арганізацыях. Сярод найвастрэйшых праблем застаецца пенсіённае забеспячэнне. «Салідны працоўны стаж і высокі заробак не з'яўляюцца сёння гарантыяй добрай пенсіі, — падкрэсліла Галіна Мяркулава. — Трэба разумець, што толькі намаганнямі прафсаюза вырашыць увесь комплекс сацыяльных праблем немагчыма, таму вельмі важна наладжваць кантакты і знаходзіць паразуменне з сацыяльнымі партнёрамі. Нягледзячы на праблемы і спрэчныя пытанні, што ўзнікаюць, можна і трэба вырашаць іх у рамках стабільна дзеючай сістэмы сацыяльнага партнёрства, якую неабходна ўмацоўваць і развіваць на ўсіх узроўнях».



### Узаемадзеянне ўлады і прафсаюзаў

Галіна Мяркулава звярнула ўвагу на эфектыўны вопыт сацыяльнага партнёрства паміж Беларускім прафсаюзам работнікаў адукацыі і навукі і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Дарэчы, ён адзін з найбольш уплывовых у краіне, аб'ядноўвае ў сваіх шэрагах больш за 580 тысяч чалавек: работнікаў як дзяржаўных, так і прыватных устаноў адукацыі, Нацыянальнай акадэміі навук, навучэнскую моладзь, аспірантаў і дактарантаў.

— У нас наладжаны сур'ёзны канструктыўны дыялог з міністэрствам, — канстатавала **старшыня галіновага прафсаюза Таццяна ЯКУБОВІЧ.** — Тэрмін «сацыяльнае партнёрства», якім сёння прынята называць узаемадзеянне ўлады і прафесійных саюзаў, — не проста гучнае азначэнне, а добра адпрацаваная практыка сумеснага вырашэння многіх актуальных пытанняў. Між іншым, у галіновае Пагадненне паміж прафсаюзам і Міністэрствам адукацыі ўключаны гарантыі для работнікаў перадпенсіённага ўзросту, жанчын, якія працуюць, маладых спецыялістаў, прафсаюзнага актыву, не вызваленага ад асноўнай працы, і іншых катэгорый работнікаў, якія працуюць на ўмовах кантрактнай формы найму.

Адна з прыярытэтных задач прафсаюза — калектыўна-дагаворная работа: наяўнасць калектыўнага дагавора ў кожнай арганізацыі, яго ацэнка на прадмет адпаведнасці пагадненням больш высокага ўзроўню, сістэматычны аналіз вынікаў яго выканання, недапушчальнасць выключэння з іх асобных нормаў.

Стан калектыўна-дагаворнай работы ў арганізацыях прафсаюза сістэматычна аналізуецца і разглядаецца на пасяджэннях кіруючых органаў, у працэсе чаго адзначаецца станоўчая тэндэнцыя па ўключэнні норм, якія паляпшаюць прававое становішча работнікаў — членаў нашага прафсаюза ў параўнанні з заканадаўствам. Разам з тым яшчэ сустракаюцца кантракты, якія патрабуюць больш прынцыповай пазіцыі як з боку кіраўнікоў арганізацый галіны, так і з боку кіраўнікоў арганізацый прафсаюза па напаўненні іх дадатковымі мерамі стымулявання працы.

### Інтэлектуальны патэнцыял галіны

Ад чаго залежыць сацыяльны статус настаўніка ў грамадстве? Адказ на гэта пытанне шукаюць ва ўсіх краінах. На жаль, прафесія настаўніка не з'яўляецца запатрабаванай сярод моладзі. У Расіі, напрыклад, сур'ёзна заклапочаны тым, як утрымаць у галіне выпускнікоў педагагічных спецыяльнасцяў, якія пасля заканчэння ВНУ рэзка мяняюць сваю прафесійную траекторыю. Невысокія зарплаты падштурхоўваюць настаўнікаў на пошук новых крыніц заробку. Многія бяруць дадатковую нагрузку, працуюць ці выкладаюць у іншых установах і арганізацыях і г. д. Спробы педагогаў палепшыць сваё матэрыяльнае становішча за кошт асваення дадатковых відаў дзейнасці нярэдка абарочваюцца належнай абачлівасцю ў выніку... 

**Сацыяльны статус работнікаў устаноў адукацыі павінен адпавядаць іх інтэлектуальнаму патэнцыялу, а работа і намаганні павінны належна аплачвацца** — у гэтай думцы сыходзяцца ўсе.

— Для нас заработная плата і сацыяльнае становішча нашых настаўнікаў — галоўнае пытанне на парадку дня, — падкрэсліў **старшыня ЦК прафсаюза работнікаў адукацыі і навукі Кыргызскай Рэспублікі Асылбек ТАКТАГУЛАЎ.** — На жаль, заробкі ў педагогаў доўгі час заставаліся зусім невысокімі, і мы паступова працавалі над іх павышэннем. Цяпер заработная плата дайшла да 400 долараў, што, як мы лічым, ужо нядрэнна. Прафсаюз разам з прадстаўнікамі ўлады змагаецца за аўтарытэт і статус настаўніка ў грамадстве. Мы не застаёмся ўбаку і актыўна ўмешваемся, калі адбываецца ціск на настаўнікаў, становімся на іх абарону. Заўважу, што і матывацыя членства ў прафсаюзе расце, калі педагогі бачаць, што мы рэальна іх абараняем...

### Абарона — на ўзроўні закона

— У сваёй рабоце мы тлумачым педагогам, што не трэба разглядаць прафсаюз як арганізацыю па выдачы навагодніх падарункаў і правядзенні культурна-масавых і спартыўных мерапрыемстваў. Наша асноўная задача — гэта абарона вашых сацыяльных правоў і прадстаўленне прафесійных інтарэсаў, — расказала **старшыня Казахстанскага галіновага прафсаюза работнікаў асветы, навукі і вышэйшай адукацыі Айгуль МУКАШАВА.** — Летась мы разгледзелі больш за 37 тысяч зваротаў ад членаў прафсаюза з усяго Казахстана. Была аказана дапамога 32,4 тысячы членаў прафсаюза па вырашэнні індывідуальных працоўных спрэчак. 33 члены прафсаюза мы абаранілі ў судзе і 17 членаў прафсаюза аднавілі на рабочых месцах (яны былі незаконна звольнены).

У Казахстане ў 2020 годзе быў прыняты адзіны на постсавецкай прасторы дзеючы Закон «Аб статусе педагога». У яго распрацоўцы прымаў непасрэдны ўдзел наш прафсаюз, а я была членам рабочай групы. Гэты закон насамрэч працуе: дзякуючы яму ў краіне прыкметна павысіўся статус педагога. Яны адчулі сябе абароненымі. У нас не могуць, як раней, прыцягнуць педагога да выканання неўласцівых яго асноўнай прафесійнай дзейнасці функцый. Калі такое адбываецца, яны адразу звяртаюцца ў прафсаюз.

У параўнанні з краінамі СНД заробкі педагогаў у Казахстане намнога вышэйшыя. Калі раней малады спецыяліст, які толькі прыступіў да працы, атрымліваў крыху больш як 100 долараў, то цяпер — каля 400. У нас прадугледжана вельмі шмат даплат.

Вялікая работа зроблена па аплаце бальнічных лісткоў. У 2015 годзе ў Працоўным кодэксе была прынята норма, паводле якой бальнічны ліст аплачваецца ў памеры 14 МРП (МРП — месячны разліковы паказчык. — **Аўт.**) — гэта было крыху менш за 100 долараў. А з мінулага года гэта сума складае ўжо больш як 200 долараў. Але мы не спыняемся і прапануем сваю методыку аплаты бальнічных, у залежнасці ад стажу работы.

Мінімальная заработная плата ў Казахстане ў мінулым годзе была ўзнята з 42 да 70 тысяч тэнге. А ў вераснёўскім сваім пасланні прэзідэнт паведаміў, што мінімальная заработная плата будзе павышана да 85 тысяч тэнге. Такім чынам, патрабаванні прафсаюза былі пачутыя, і на працягу двух гадоў мінімальная заработная палата павысілася больш чым удвая.

Апошнія гады ў Казахстане намецілася станоўчая тэндэнцыя: шмат маладых людзей паступаюць у магістратуру і бакалаўрыят на педагагічныя спецыяльнасці, прычым з вельмі высокімі баламі. Дарэчы, магістр навукова-педагагічнага кірунку да свайго акладу атрымлівае даплату ў памеры 10 МРП, а гэта складае больш як 100 долараў у месяц у валютным эквіваленце. А студэнты педагагічных і медыцынскіх спецыяльнасцяў атрымліваюць у Казахстане павышаную стыпендыю.

Удзельнікі шмат гаварылі пра асаблівасці прафсаюзнай працы ў розных краінах, пра тое, як яны працуюць на павышэнне прыцягальнасці прафсаюзаў для моладзі. Так, у Казахстане для навучання маладзёжнага прафактыву арганізоўваюць летнія прафсаюзныя лагеры, на якіх праводзяць прававую вучобу, вучаць кантраляваць правільнасць налічэння заработнай платы і інш.

Беларускі прафсаюз работнікаў адукацыі і навукі сумесна з Федэрацыяй прафсаюзаў ужо некалькі гадоў фінансуе сацыяльныя праекты для моладзі, дапамагае ўвасобіць у жыццё яе цікавыя і карысныя ідэі. Напярэдадні з'езда дэлегаты наведалі Міжнародны ўніверсітэт «МІТСО». Гасцей зацікавіла спецыфіка ВНУ і алгарытм падрыхтоўкі прафсаюзных кадраў.

Вынікам работы з'езда стала праграма цеснага супрацоўніцтва на найбліжэйшыя пяць гадоў. Размова ідзе аб абмене вопытам, новых праектах і правядзенні сумесных мерапрыемстваў.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ВЯЛІКІ ТЭАТР: НОВЫ СЕЗОН

**Гэта 91-ы сезон тэатра. Развітаўшыся з гледачамі на высокай ноце святкавання юбілею, трупа пачынае чарговы творчы адлік з прэм'ерных спектакляў. Але што далей? Варта зразумець тэндэнцыі, асабліва цяпер, калі ўсе — і супрацоўнікі, і тэатралы — чакаюць пачатку 2024 года, калі павінны змяніцца падыходы ў фінансаванні дзейнасці тэатраў. Пра гэта ішла гаворка ў тым ліку на агульным сходзе калектыву, які прайшоў ва ўрачыстай абстаноўцы: з дэманстрацыяй фільма пра Вялікі, яркімі нумарамі і афіцыйнымі выступленнямі. Ад імя Міністэрства культуры Беларусі Ірына Дрыга павіншавала з пачаткам сезона і адзначыла, што мінулы сезон тэатр правёў на вышыні: з добрымі эканамічнымі паказчыкамі, з перавыкананнем усіх даведзеных заданняў. І з цудоўнымі творчымі дасягненнямі, прэм'ернымі спектаклямі, пашырэннем гастрольнай дзейнасці.**



**Генеральны дырэктар тэатра Кацярына ДУЛАВА** мела свайго роду справаздачу перад сходам:

— Мэтанакіраваная праца па аптымізацыі структуры тэатра дапамагае нам стварыць эфектыўную мадэль упраўлення з рацыянальным выкарыстаннем штатнай колькасці супрацоўнікаў, якая маецца. На 1 верасня 2023 года ў штаце значыцца 830 чалавек, у тым ліку мастацка-пастановачны і артыстычны персанал — 438 чалавек, вытворча-абслуговы персанал — 392 чалавекі. Ідзе папаўненне творчага складу маладымі перспектыўнымі кадрамі. У 2023 годзе ў тэатр прыйшлі 13 маладых спецыялістаў. У найбліжэйшы час трэба будзе яшчэ раз перагледзець штатны расклад і завяршыць запланаваны працэс аптымізацыі. Фінансава эканамічная дзейнасць хвалюе нас не менш, чым творчая. Прыемна адзначыць, што ад студзеня да ліпеня 2023 года тэатрам выкананы ўсе асноўныя паказчыкі вытворча-фінансавага плана. Пры плане 217 спектакляў было прадстаўлена 222 (102 працэнты выканання). Па колькасці гледачоў: пры плане 124 тысячы чалавек нас наведалі 153 тысячы чалавек (122 працэнты выканання). Аб'ём пазабюджэтных паступленняў: пры плане 3 мільёны 937 тысяч рублёў мы зарабілі 5 мільёнаў 442 тысячы рублёў (што складае 138 працэнтаў выканання). Гэтая дынаміка абумоўленая павелічэннем сярэдняй запаўняльнасці залы на 25 працэнтаў, ростам коштаў квіткоў у сярэднім на 30 працэнтаў. Выручка ад продажу квіткоў складае 81 працэнт ад сумы пазабюджэтных паступленняў. Сярэдняя заработная плата за бягучы перыяд склала 1831 рубель, гэта 23 працэнты росту ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Дынаміка сведчыць пра тэндэнцыю росту сродкаў, якія накіроўваюцца на стымуляцыйныя выплаты супрацоўнікам тэатра. Бюджэтнае фінансаванне на 2023 год складае 19 мільёнаў 480 тысяч рублёў. 88 працэнтаў усяго фінансавання накіроўваецца на пакрыццё выдаткаў на аплату працы згодна са штатным раскладам і ўтрыманне будынка тэатра. 9 працэнтаў фінансавання — на стварэнне і аднаўленне пастановак і правядзенне гастроляў. Два працэнты — на набыццё абсталявання, адзін — на бягучы рамонт будынка.

Але чыста па-глядацку хочацца зразумець, што нас чакае новага ў творчым кірунку. А тут ёсць зрухі: у Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра Беларусі з'явіўся галоўны дырыжор! Ім стаў народны артыст Рэспублікі Башкартастан Арцём Макараў, добра вядомы айчыннай публіцы дзякуючы ўдзелу ў нашых спектаклях. 12 гадоў ён працаваў галоўным дырыжорам Башкірскага тэатра оперы і балета, лічыць, што гэта быў нядрэнны досвед як для спецыяліста. Зусім нядаўна стаў яшчэ галоўным дырыжорам маскоўскага тэатра Наталлі Сац. Магчымасць сумяшчэння працы ў двух тэатрах абгаворвалася з іх кіраўніцтвам, усе пагадзіліся, што можна паспрабаваць.

Новы галоўны мастак Вялікага Любоў Сідзельнікава, якую і трупа, і публіка добра ведае. «Такой колькасці прадстаўлення, якую дае тэатр, складана ўявіць. Вучылася ў Яўгена Чамадурава, народнага мастака Беларусі, які працаваў у гэтым тэатры. А другім педагогам быў Барыс Герлаван, які паспяхова працуе дагэтуль. Яна шчыра радуецца, што ў тэатра шмат працы. І найперш гэта прэм'еры. Першую рыхтуе галоўны балетмайстар Вялікага тэатра Беларусі, заслужаны артыст Расіі Ігар Колб. Напрыканцы 2023 года ён прадставіць балет «Ілюзіі кахання» .

А ўжо ў 2024 годзе оперу «Іаланта» прадставіць галоўны рэжысёр тэатра Ганна Маторная. На другую палову сезона запланавана другая балетная прэм'ера:

# Палац паразумення,

## альбо Тэндэнцыі «Восеньскага салона»

**Галоўная выстаўка восені, якую асабліва чакаюць аматары мастацтва, — «Восеньскі салон з Белгазпрамбанкам» — пачала работу ў Палацы мастацтва. Чаму чакаюць? Скончылася летняе зацішша ў культурным жыцці, а творчасць абуджае энергію стваральнасці, якая неабходная ў жыцці чалавека, — і, калі ласка, глядзіце, думайце, спрачайцеся, абуджайцеся да актыўнасці. Бо ўсё-такі «Салон» — гэта энергія моладзі, якая наталяе так ці інакш. А моладзь глядзіць на свет цікаўнымі вачыма, яна шукае свой шлях у мастацтве — і тут цікава глядзець, якія варыянты мае і што прапануе. Бо ў мастацтве ёсць адна з вельмі важных уласцівасцяў — яно можа быць носьбітам інавацыйнага мыслення. І ўсё ж застаецца і тое, што здаўна так шануюць, — уменне паказаць прыгажосць, стварыць гармонію і наталіць радасцю.**



Гэтая радасць сустрэч на «Восеньскім салоне» застаецца адным з істотных чыннікаў мастацкага жыцця Беларусі. Тут сустракаюцца творцы, каб паглядзець на работы сваіх калег. Тут сустракаюцца гледачы, каб іх абмеркаваць. Тут сустракаюцца творцы з гледачамі, каб лепш разумець адзін аднаго. І глеба ёсць: як заўсёды для нас падрыхтавалі вялікую экспазіцыю.

— Сёлета арганізатары атрымалі каля 1000 заявак. У выніку адабралі 220 удзельнікаў, — адзначае **мастацтвазнаўца Кацярына ЯНКОЎСКАЯ.** — Узровень работ розны, таму што «Восеньскі салон» — у першую чаргу фестываль мастацтва, які кожны год абнаўляецца. Даволі шмат удзельнікаў, якія падалі заяўкі ўпершыню. А некаторыя аўтары штогод удзельнічаюць у гэтым праекце. Мы адбіралі найбольш удалыя работы — было з чаго. На этапе, калі пакінулі для разгляду каля 400 заявак, адзначылі аўтараў, якія прапанавалі цікавыя работы, можна было спыніцца і на гэтым. Але мы пачалі глядзець на колькасць. Напрыклад, калі толькі адна ўдалая, то гэтага было недастаткова, каб стаць удзельнікам «Салона». Таму што выставачная прастора хоць і вялікая, але ж абмежаваная. А для гледача важна, каб не ўзнікала адчування перагружанасці экспазіцыі.

У «Восеньскага салона з Белгазпрамбанкам» ёсць асаблівасць, якая датычыцца ролі гледача. А ён, між іншым, можа паўплываць на лёс аўтараў. Так, напрыклад, улюбёнай мастачкай наведвальнікаў салонаў стала Алеся Скарабагатая. Яе жывапісныя работы прыцягвалі вялікую ўвагу публікі, што адлюстроўвалася падчас галасавання гледачоў — гэта свайго роду «фішка» мінскага мастацкага «Салона». І што ты з гэтым будзеш рабіць? Немагчыма адмовіцца ад галасавання гледачоў наогул: гэта і злучанасць з публікай, і нейкая інтрыга... Даць магчымасць «павыйграваць» іншым ці дапамагчы звярнуць увагу на іншых аўтараў магчыма. Для гэтага існуюць эксперты, якія дапамагаюць адбіраць удзельнікаў, але і могуць выстаўляць балы за кожны твор.

— Цяпер ёсць Гран-пры, прысуджаецца першае, другое і трэцяе месцы ў кожнай з шасці намінацый, — тлумачыць Кацярана Янкоўская. — Мы не можам навязаць нейкую думку гледачам. Як не можам ігнараваць той факт, што Алеся Скарабагатая стварае новыя работы кожны год. Людзі самастойна галасуюць і выбіраюць згодна з уласнымі густамі.

Такім чынам, публіка галасуе пераважна за майстэрства. Ёй падабаецца мастацтва старых майстроў, яго сінтэз, нейкія канцэптуальныя прыёмы, звязаныя з гэтым. Але ў наш час мастацтва мяняецца, што немагчыма ігнараваць. А людзі, якія ходзяць на выстаўкі, мяркуюць пра яго ўсё яшчэ з пазіцый мастацкай класікі. Але шмат што змяніла XX стагоддзе, а тым больш ужо XXI з яго выклікамі...

— Усё ж рэалістычная школа для нас базавая, гэта нас шмат у чым адрознівае, — кажа Кацярына. — У Еўропе, напрыклад, такія выставы выключаюць рэалізм у прынцыпе, а ў нас ён яшчэ застаецца, выдзелены нават асобны сегмент у экспазіцыі. У гэтым ёсць і плюс, і мінус, асабіста для мяне. Плюс у тым, што нашы мастакі даволі добра валодаюць майстэрствам, а з іншага боку, вельмі часта гэта не дае магчымасці выйсці ў плоскасць нейкіх ідэй і больш складаных канцэптаў. Але мы бачым, што і глядач да гэтага не надта гатовы. Дзякуючы такім праектам мы бачым густы аўдыторыі і яе стаўленне да мастацтва, і можам рабіць нейкія высновы для будучых праектаў, маленькіх выставак. Акрамя таго распрацоўваем лекцыйныя і экскурсійныя праграмы. Я бачу па экскурсіях, што, калі тлумачыш, у чым сэнс больш складаных работ, то людзі пачынаюць больш у гэтым разбірацца і разумеюць, чаму цікава назіраць за нечым больш абстрактным, больш складаным, на першы погляд не такім відавочным. Мне падаецца, гэты момант вельмі ўплывае на аўдыторыю. Таму актыўна развіваем экскурсіі. Дзеля мастацкага асветніцтва была «Ноч музеяў», а 23 верасня будзе «Ноч мастацтва». Ёсць майстар-класы, калі адбываюцца сустрэчы з аўтарамі, што таксама дапамагае працэсу разумення мастацтва на больш глыбокім узроўні.

— На «Восеньскім салоне» складана, напэўна, сфарміраваць канцэпцыю экспазіцыі, паколькі розныя стылі, розныя аўтары, акрамя таго яшчэ вялікі аб'ём работ?..

— Калі казаць пра ідэю «Восеньскага салона», то яна нават у пачатку XX стагоддзя зараджалася ў першую чаргу для таго, каб паказаць, што новага створана за апошні год. Яшчэ адна задача — сфарміраваць рынак. І французскі «Салон» ставіў прыкладна такія ж задачы. Я кожны год здзіўляюся, што прыходзяць заяўкі ад абсалютна новых удзельнікаў, і іх вельмі шмат. Значыць, фарміруецца новая генерацыя мастакоў, нават за гэтым працэсам цікава назіраць. Тут не будзе выразна выяўленай канцэпцыі, таму што сам сэнс выстаўкі — разнастайнасць стыляў, відаў мастацтва, сюжэтаў, аўтараў. Але мы можам прасачыць тэндэнцыі. Напрыклад, сёлета я бачу, што ёсць нейкае імкненне адлюстраваць інтымную нацыянальную культуру — гэта першае. Другое: ёсць імкненне да яркага насычанага колеру ў абстрактным мастацтве.

мастацкі кіраўнік тэатра Валянцін Елізар'еў рыхтуе пастаноўку балета «Папялушка» на музыку Сяргея Пракоф'ева. А ў маі ў афішу тэатра вяртаецца опера «Набука» Джузэпэ Вердзі, ажыццявіць сваю рэжысёрскую версію ў Беларусі прапануе вядомы італьянскі тэатральны і оперны рэжысёр Джанкарла Дэль Монака.

А што нам баліць... Нацыянальная тэма. Няпроста да яе падабрацца, каб стварыць новыя оперныя і балетныя творы. Дапамог архіў партытур, якія ёсць у тэатры: а тут творы беларускіх кампазітараў, якія стварылі для Вялікага ў папярэднія гады. І гэта творы, з якімі можна працаваць, калі і не аднавіць цалкам, то выкарыстаць асобныя эпізоды. Да 70-годдзя вызвалення Беларусі тэатр падрыхтуе шэраг канцэртных і тэатральных вечароў, галоўнай ідэяй якіх стане зварот да нашай тэатральнай і музычнай спадчыны. Гаворка пра оперы і балеты, якія былі раней напісаны для гэтага тэатра і прысвечаны ваеннай тэматыцы. У першую чаргу гаворка пра балет Яўгена Глебава «Альпійская балада», асобныя элементы якога былі прадстаўлены народным артыстам Беларусі Канстанцінам Кузняцовым. Але разам з задумамі для айчыннага гледача тэатр плануе актыўную гастрольную дзейнасць.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**




І яшчэ адна важная тэндэнцыя: фарміраванне рынку мастацтва. Мы можам прааналізаваць цэнаўтварэнне, паглядзець, колькі каштуе мастацтва ў Беларусі. І гэта важна не толькі з пункту гледжання саміх продажаў, колькі інтэграцыі беларускага мастацтва ў сусветны кантэкст. Натуральна, узнікае разуменне, што мастацкая работа мае цану і з'яўляецца не толькі прадметам для выставачнай дзейнасці, але і для інвестыцый.

Гэты працэс развіваецца. Сёння ёсць выхад на інтэрнэт-пляцоўку artcenter.by, якая стварае глебу для электроннага гандлю ў сферы мастацтва. Па сутнасці, гэта адна з нешматлікіх платформаў у Беларусі, звязаных з выставачным працэсам. Такім чынам адбываецца і прэзентацыя мастацтва ў анлайн-фармаце.

І на «Восеньскім салоне» ў аматараў тэхналогій ёсць магчымасць удакладняць цану твораў і інфармацыю пра аўтараў. Гэта ўсё не выключае эмацыянальнага ўзрушэння ад агляду выстаўкі.

**Ларыса ЦІМОШЫК.**

# «ДАРАГІ СЯБАР, ДАЛЁКІ І БЛІЗКІ...»

## Гісторыя двух партрэтаў Аляксандра Кішчанкі і Сяргея Параджанава

**Сёлета споўнілася 90 гадоў з дня нараджэння народнага мастака Беларусі, лаўрэата Дзяржаўных прэмій Аляксандра Міхайлавіча Кішчанкі, вядомага найперш яго знакамітым «Габеленам стагоддзя». Менш вядомыя, але надзвычай цікавыя яго шматлікія, вельмі эфектныя партрэты, прадстаўленыя нядаўна на выставе ў Палацы мастацтваў. Але маю ўвагу прыцягнуў невялікі партрэт in memoria, што паказвае Сяргея Параджанава, найвядомейшага рэжысёра-наватара, які ўваходзіць у дваццатку найлепшых кінарэжысёраў свету, пэндзля народнага мастака Беларусі Аляксандра Кішчанкі і невялічкі партрэт-накід работы Параджанава Элеаноры Язерскай.**



Партрэт працы Кішчанкі — гэта, уласна, не партрэт, а ўсяго толькі эскіз 34 на 34 см, створаны ў 1994 годзе. Ён адлюстроўвае Параджанава на схіле гадоў.

Партрэт узнік выпадкова і невыпадкова: Кішчанку трапілася нататка ў газеце, дзе публікавалася апошняя фатаграфія Параджанава і яго малюнкі. Яна чымсьці ўразіла 60-гадовага майстра, ускалыхнула яго памяць...

Ён быў заняты вялікай працай — Габеленам стагоддзя. Аднак адклаў справы і напісаў партрэт старога сябра. На газетным фотаздымку Параджанаў падобны да старажытнагрэчаскага філосафа: у яго высокі лоб, увесь у зморшчынах, засяроджаны погляд вялікіх цёмных вачэй. Густыя бровы, буйны нос, нейкі горкі прыкус вуснаў, энергічнае падбароддзе, сівая прыгожая барада, галава, якая магутна сядзіць на тулаве, збітая моцная постаць, ва ўсёй знешнасці адчуванне грунтоўнасці.

Не тое ў Кішчанкі. Гэта мемарыяльны партрэт. Мастак успамінае Параджанава такім, якім ён быў у маладосці. Ён і тут пастыр душ чалавечых, і філосаф у хітоне, і ў вобразе маладога сатыра са смутнымі вачыма. На фоне — статак авечак, навеяных фільмам «Колеры граната», з усталяванымі на іх спінах запаленымі памінальнымі свечкамі.

Дзіўна ў гэтым партрэце ўсё: і яго нязвыкла маленькі памер — Кішчанка звычайна любіў вялікія фарматы. І дата (прайшло ўжо чатыры гады пасля смерці рэжысёра), сама кампазіцыя гэтага партрэта са статкам авечак. Магчыма, майстар хацеў зрабіць вялікі партрэт, а гэта толькі папярэдні накід, але не паспеў.

Параджанаў быў найважнейшым чалавекам-вяхой, гуру ў жыцці маладога Кішчанкі, нейкі час быў яго настаўнікам і кумірам. «Шмат ён для мяне зрабіў у разумовым плане», — казаў мастак ужо ў сталым веку.

Аляксандр Міхайлавіч быў добра знаёмы з ім, пачынаючы яшчэ са студэнцкіх часоў у Львове, калі малады Параджанаў шукаў там натуру для свайго фільма «Андрыеш», а Кішчанка вучыўся ў мастацкім інстытуце.

У Кіеве, дзе Кішчанка пачаў працаваць пасля заканчэння Львоўскага інстытута дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва з 1960 года, жыў на кватэры Параджанава — у доме № 1 па Брэст-Літоўскім праспекце.

Параджанаў нядаўна развёўся са сваёй жонкай Святланай, Кішчанка толькі ажаніўся са сваёй першай жонкай — выкладчыцай інстытута, габеленшчыцай Ангелінай Бельцюковай, у іх нарадзіўся першынец — сын Саша. Ангеліна з немаўляткамсынам з'ехалі ў Маскву, дзе жылі яе бацькі. І Параджанаў, старэйшы за Кішчанку на 9 гадоў, прытуліў яго ў сябе. Тады ён здымаў свой знакаміты фільм «Цені забытых продкаў». Сашко — так называў Параджанаў Кішчанку — удзельнічаў, дапамагаў, чым мог, і нават па яго словах прыдумаў сцэну з падпаленымі дрэвамі ў параджанаўскім фільме.

Ад гэтага перыяду захавалася некалькі каларытных успамінаў самога Аляксандра Міхайлавіча. Параджанаў як сын армяніна-антыквара любіў антыкварыят, наогул купляць старыя рэчы на рынку, і адчайна і доўга гандляваўся, не выбіраючы выразаў, пакуль яму не саступалі за бясцэнак. І прадавец, і пакупнік адчувалі пры гэтым велізарнае задавальненне. Аднойчы Кішчанка з нагоды танна купіў і прыцягнуў у дом раскошную антыкварную шафу. Вырашылі выпаліць на ёй малюнкі, не клапоцячыся аб тым, што сапсуюць антыкварную мэблю, намалявалі нейкія кветкі электрычный плойкай. Паваліў дым ад падпаленага дрэва. А калі малюнак быў гатовы, у акне паказаліся твары раз'юшаных пажарных. Так пасля сцвярджаў Параджанаў, а Кішчанка і не супярэчыў.

Другая гісторыя звязана са знакамітай балерынай Маяй Плісецкай. У Параджанава была ідэя паставіць балет на музыку Радзівона Шчадрына паводле «Дэмана» Лермантава, у галоўнай ролі Тамары планавалася Плісецкая. Яны былі знаёмыя яшчэ з Тбілісі, калі сябры прывялі Плісецкую, якая там гастралявала, паглядзець на знакамітага на ўвесь свет дзівака-рэжысёра. Параджанаў папрасіў у яе тры наборы бальных туфлікаў і ўгаварыў на іх распісацца. Плісецкая ахвотна гэта зрабіла. Ці трэба казаць, што Параджанаў прадаў дарагі сувенір калекцыянерам і зладзіў на атрыманыя грошы грандыёзную гулянку... А потым сам купіў бальныя туфлікі і распісаўся на іх замест Плісецкай.



Гэта быў непаўторны майстар перфомансу і хэпі-энду, містыфікатар і вясёлы дзівак. Любоў да карнавалу і розыгрышаў падтрымліваў і Кішчанка, тут яны разумелі адзін аднаго з паўслова. У Кіеве Плісецкая таксама прыйшла ў госці да Параджанава. У кватэру заляцеў малады Кішчанка і павітаўся з Плісецкай коратка, хоць і з павагаю. «Не так вітаешся са знакамітай балерынай, — сказаў Параджанаў. — Выйдзі і прывітайся як уласціва мужчыну. Здымі туфлік і пацалуй яе нагу. Гэта ж зорка!» Кішчанка падкаціў гульню і паўторна пагрукаў, увайшоў у пакой і зрабіў усё, што ад яго патрабавалася. Вельмі любіў успамінаць гэтае незвычайнае знаёмства мастак ужо ў Мінску, куды ён прыбыў з сям'ёй на запрашэнне Уладзіміра Стальмашонка ў 1963 годзе для працы выкладчыкам Тэатральна-мастацкага інстытута. Сябры сустракаліся часта, ездзілі ў госці.

Па запрашэнні кінематаграфістаў Параджанаў прыехаў у Мінск у 1972 годзе. Гэта была добрая нагода сустрэцца са старым сябрам. У Дом кіно набілася столькі народу, што яблыку не было дзе ўпасці. Параджанаў расказваў пра свой фільм «Саят-Нова» («Колер граната»).

Потым шляхі знакамітага рэжысёра і мастака разышліся. Параджанаў замоўк на 10 гадоў і абарваў сувязі са шматлікімі сваімі знаёмымі, але не з Кішчанкам. Кантакты іх доўжыліся да канца жыцця Параджанава ў 1990 годзе.

Сябры пры выпадку пасылалі адзін аднаму маленькія падарункі, кнігі. Параджанаў аддаваў перавагу варэнню са знакамітых ерэванскіх грэцкіх зялёных арэхаў. Так было і ў 1980-я гады, калі сябры зноў пачалі кантактаваць, і Параджанаў стаў часцей бываць у Кіеве, куды да яго часам наведваўся і Кішчанка з сябрамі. Аднойчы паслаў яму таксама пасылачку з Мінска праз Элеанору Язерскую, знакамітую мінскую тэледзіву. Параджанаў цалкам ацаніў экстравагантны выгляд Элеаноры і даслаў Кішчанку падзяку-запіску. Мяркуючы па згадванні смерці сябра рэжысёра мастака Рыгора Гаўрыленкі (1927—1984), які даў Параджанаву ідэю здымкі фільма «Цені забытых продкаў», напісана яна ў сярэдзіне 1980-х гадоў.

Цікава, як ён звяртаецца да Аляксандра Міхайлавіча: «Дарагі сябар, далёкі і блізкі, чужы і родны!.. Чакаю цябе і люблю»... Акрамя ліста з малюнкамі, быў пасланы і партрэт Элеаноры Язерскай, выкананы шарыкавай ручкай з елачнымі бліщчынкамі на аркушы фармата А-4.

«...Дама Ан Руж (у чырвоным), добрая і артыстычная. Афіна Палада!» — пісаў Параджанаў. І паслаў ёй «цуд-партрэт» з прыпіскай, што ён можа «не спадабацца лэдзі». Партрэт гэты захоўваецца ў Мінску ў пляменніцы Элеаноры Язерскай, а аўтограф ліста з малюнкамі Параджанава ва ўдавы Кішчанкі — Ніны Уладзіміраўны. «Мы з Элеанорай Язерскай хацелі наведаць Параджанава ў Ерэване ў 1990-м, але не паспелі, ён ужо памёр», — напісала Эвеліна Домніч.

Хоць іх адносіны не адрозніваліся сістэматычнасцю — яны маглі не бачыцца і не пісаць адзін аднаму гадамі, Кішчанка памятаў пра сябра. Магчыма, ён хацеў увесці партрэт Параджанава ў Габелен стагоддзя ў шэраг знакамітых творцаў XX стагоддзя, аднак чамусьці аддаў перавагу настаўніку Параджанава рэжысёру Аляксандру Даўжэнку.

Але ўнутраная сувязь іх была бясспрэчная. Карцінная эстэтыка параджанаўскага фільма «Колер граната» відавочна ў некаторых кампазіцыях Кішчанкі, які ўводзіў у свае творы сімвалічныя атрыбуты з яго кадраў-карцін: жанчына з пеўнем у руках, лесвіцы ў неба, інтэр'ер майстэрні як тэатральная прастора з персанажамі, якія ажываюць, эмблематычнасць і застыласць поз.

Няма больш розных творцаў, чым гэтыя двое сяброў. Параджанаў як мастак быў зусім іншым. Яго мастацтва не прызначалася для продажу, ён мог зрабіць шэдэўр на накрыўцы ад бутэлькі кефіру, шчодра дарыў свае карціны і лялькі, малюнкі сябрам.

Кішчанка выконваў адказныя дзяржаўныя заказы, рабіў вялізныя габелены для ЦК партыі і Опернага тэатра (1985), пісаў маштабныя партрэты і карціны. Параджанаў пайшоў сваім шляхам і застаўся такім, які ён быў — нязменным майстрам відавочнага і прыгод, фігурай трагічнай і самотнай. Ён памёр у 1990 годзе, не дажыўшы да стварэння свайго музея ў Ерэване. Праз сем гадоў гэты свет пакінуў і Аляксандр Кішчанка, які меў усе рэгаліі прызнанага ўладамі мастака.

Фантасмагарычна-касмічнае ўздзеянне фільмаў рэжысёра на светапогляд маладога Кішчанкі, яго філасофскае мысленне, блізкія іх творчыя знosіны не прайшлі дарма. Свабода творчасці, асабліва ў партрэтах, сумяшчэнне несумяшчальнага, філасофскае разважанне над галоўнымі пытаннямі жыцця, — гэтая прышчэпка Параджанава была атрыманая ў яго раннія гады, як і цікавасць да космасу, філасофіі, біблейскай і антычнай тэматыкі.

І тое, што ён задумаў і стварыў у апошнія гады свой знакаміты Габелен стагоддзя, выдатныя габелены з прарывамі прасторы ў купал неба з выхадам у Сусвет, з барацьбой паміж жыццём і смерцю, дабром і злом, Хрыстом і Антыхрыстам, любоўю і нянавісцю, — хто ведае, магчыма, гэта тое, што ён запазычыў у маладосці ад Параджанава, духоўна звязаны з яго гуманістычнай эстэтыкай «у пастаноўцы так званых «праклятых» пытанняў нашага быцця: жыццё — каханне — смерць, — што перажываюцца адзінокім чалавекам».

Таму і дарагі гэты маленькі партрэт як даніна памяці сябру і Настаўніку.

**Надзея УСАВА,**
**вядучы навуковы супрацоўнік**
**Нацыянальнага мастацкага музея.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5. Сайт в интернете: www.cpo.by |
| **Продавец** | ОАО «Агат – электромеханический завод», 220114, г. Минск, пр-т Независимости, 115, каб. 317 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б. www.ipmtorgi.by |

Предмет электронного аукциона
**Оборудование и транспортные средства, бывшее в употреблении, по адресу: г. Минск, пр-т Независимости, 115 (территория предприятия)**

| Лот № | Наименование | Год выпуска | Инвентарный номер | Начальная цена с НДС 20 %, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Обрабатывающий центр ЕС-4000 | 1986 | 42314012 | **11 370,24** |
| 2 | Электропечь ЭВ3,3/11.5МО | 1971 | 42412043 | **4 063,68** |
| 3 | Печь СЭВ-5,5/11,5 Н2 | 1988 | 42412058 | **13 756,68** |
| 4 | Настольно-сверлильный станок 2Н106П | 1974 | 42306179 | **660,24** |
| 5 | Станция телефонная автоматическая СИС 4000-04 | 2008 | 45602064 | **1 330,56** |
| 6 | Станок токарный EEN-320 | 1989 | 42301242 | **5 649,60** |
| 7 | Гибочная машина собственного изготовления | 1957 | 42902020 | **381,60** |
| 8 | Вышка ZIL-130 МШТС-4М КА2919 | 1986 | 50301037 | **3 696,00** |
| 9 | Грузопассажирский вагон GAZ-2752 МА1854 | 2004 | 50301076 | **1 248,00** |
| 10 | Рабочее место для зачистки облоя на пластмассе | 1988 | 42905278 | **806,40** |
| 11 | Рабочее место для зачистки облоя на пластмассе | 1988 | 42905281 | **806,40** |
| 12 | Полуавтомат с ПУ для кольцевой намотки СНТУ-В-901 | 1992 | 42701072 | **441,60** |
| 13 | Настольно-сверлильный станок 2М-112 | 1984 | 42306254 | **501,60** |
| 14 | Станок шлифовально-зачистной 3К634 | 1991 | 42311045 | **453,60** |

Цена снижена на 20 % по лотам №№ 4, 5

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/счет BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ» (BYN); БИК BELBBY2X. Получатель платежа – **ЗАО «Центр промышленной оценки».** УНП 191 021 390

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10** рабочих дней после электронных торгов. **Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона** |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **10 (десяти) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Порядок проведения и оформления участия в электронных торгах**

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by.
Ответственность участника аукциона, его права и обязанности, **штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.
Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение от 1 до 10 % от цены продажи лота в течение 3 рабочих дней после проведения электронных торгов

Предыдущая публикация извещения о проведении аукциона по лотам №№ 1–5 опубликована в газете «Звязда» 05.07.2023

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **12.10.2023 г.** с 10.00 по с 11.00. Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **11.10.2023 г.** до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 280-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by** |

## ИНФОРМАЦИЯ О ФОРМИРОВАНИИ РЕЕСТРА ВЛАДЕЛЬЦЕВ ЦЕННЫХ БУМАГ

| | |
|---|---|
| Полное наименование и местонахождение акционерного общества | **ОАО «Элегант»** Минская область, г. Жодино, пр-т Ленина, 22 |
| Наименование уполномоченного органа акционерного общества и дата принятия им решения, в соответствии с которым осуществляется формирование реестра акционеров | Наблюдательный совет ОАО «Элегант» Протокол заседания № 12 от 01.09.2023 года |
| Дата, на которую осуществляется формирование реестра акционеров | **05.09.2023 г.** |

УНН 600039318

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
**(Организатор аукциона)**
извещает о проведении открытого аукциона на право размещения средства наружной рекламы на недвижимом имуществе, принадлежащем **УП «Кирмаш»** на праве хозяйственного ведения

**Аукцион состоится 12.10.2023 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4**

**Лот № 1.**
### Право размещения средства наружной рекламы на недвижимом имуществе

Вид средства наружной рекламы – светодиодный экран.
Размер – 10240х6080 мм. Площадь – 62,26 кв. м.

**Место размещения средства наружной рекламы** – часть фасада здания ТЦ «Кирмаш», по адресу: г. Минск, пр-т Дзержинского, 100 (над пешеходной аркой со стороны пр-та Дзержинского).
**Начальная цена** – 1 000,00 руб. с НДС 20 %. **Задаток** – 1 000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %. Штраф – 100 базовых величин.
**Срок договора на размещение наружной рекламы** – 7 лет с даты оформления паспорта средства наружной рекламы.
**Необходимые условия**
Для установки подготовить проект, удовлетворяющий всем требованиям безопасности конструкции и монтажа. Светодиодный экран с электрооборудованием должен быть закреплен на общем металлическом каркасе, анкерным креплением к стене здания. Электропитание экрана необходимо из внешнего источника. Корпус экрана композиционный, алюминиевый каркас, блоки на магнитах с фронтальным обслуживанием. Параметры: шаг пикселя 5 мм, размер модуля 320х160 мм, средняя потребляемая мощность 0,25 кВт/м$^2$, максимальная потребляемая мощность 0,85 кВт/м$^2$, срок службы не менее 100 000 часов. Вывод изображения на экран осуществляется удаленно. Видеоролики идут без звука.
Аукцион проводится в соответствии с Положением «О порядке проведения торгов на право размещения средств рекламы на недвижимом имуществе», утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 07.07.2021 № 395 «О мерах по реализации Закона Республики Беларусь «Об изменении законов по вопросам рекламы».
**Заявления на участие и необходимые документы принимаются** с 11.09.2023 в рабочие дни с 8.30 до 12.00, с 13.30 до 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 7.
**Окончание приема заявлений с прилагаемыми документами и задатков:** 06.10.2023 в 16.00.
Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в аукционе 12 октября 2023 г. по продаже права размещения средства наружной рекламы на недвижимом имуществе.
**Лицо, желающее принять участие в аукционе,** не позднее срока, указанного в извещении о проведении аукциона, должно представить Организатору аукциона следующие документы:
- заявление на участие в аукционе;
- соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (в двух экземплярах);
- заявление об ознакомлении с местом размещения средства наружной рекламы и документами на него;
- заверенная банком копия платежного документа о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет Организатора аукциона;
- копия документа, подтверждающего государственную регистрацию юридического лица или индивидуального предпринимателя, желающих принять участие в аукционе;
- эскиз средства наружной рекламы, выполненный в цвете на бумажном носителе в формате А4 или электронном носителе.

При подаче Организатору аукциона документов для участия в аукционе и заключении соглашения представляются:
- физическим лицом, в том числе индивидуальным предпринимателем, – документ, удостоверяющий личность;
- представителем физического лица, индивидуального предпринимателя, юридического лица – оригинал документа, подтверждающего его полномочия, и документ, удостоверяющий личность.

Выигравшим аукцион признается участник, предложивший наиболее высокую цену за Лот, либо единственный участник, согласный приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на пять процентов.
**Условия аукциона**
Победитель аукциона либо единственный участник, согласный приобрести Лот по начальной цене, увеличенной на пять процентов, обязан:
1. Подписать с УП «Кирмаш» договор на размещение средства наружной рекламы в течение 10 рабочих дней со дня проведения аукциона (после предъявления УП «Кирмаш» платежных документов, подтверждающих оплату стоимости Лота, а также возмещение стоимости затрат на организацию и проведение аукциона).
2. В течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона обязан перечислить на расчетный счет УП «Кирмаш» сумму, за которую продан Лот, за вычетом внесенной им суммы задатка;
3. Обязан перечислить на расчетный счет Организатора аукциона денежные средства в счет возмещения стоимости затрат на организацию и проведение аукциона на основании счета-фактуры в течение 5 рабочих дней со дня проведения аукциона;
4. Предоставить УП «Кирмаш» 15 % эфирного времени за используемую площадь части фасада здания для размещения средства наружной рекламы.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайтах Государственного комитета по имуществу Республики Беларусь gki.gov.by и Организатора аукциона ino.by

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

ИНДУСТРИЯ ИННОВАЦИЙ юридическая компания
· Взыскание задолженности
· Проведение торгов
· Ликвидация
· Юридические услуги

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПУБЛИЧНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ (АУКЦИОНА)

| | |
|---|---|
| **Организатор публичных торгов (аукциона)** | ООО «Индустрия Инноваций», г. Минск, Старовиленский тракт, д. 10, пом. 4Н Сайт в интернете: www.iin.by, https://iintorgi.by |
| **Продавец** | ООО «Белинвестплаза», 220030, г. Минск, ул. Мясникова, д. 32, офис 503 |

**Предмет публичных торгов (аукциона)**

| Лот № | Наименование |
|---|---|
| **1** | **Легковой автомобиль универсал (UNIVERSAL) RENAULT KANGOO II** |

**Начальная цена продажи** – 10 680,00 бел. руб. с учетом НДС

**Задаток 3 %** от начальной цены предмета публичных торгов (аукциона) в белорусских рублях перечисляется на р/с BY48OLMP30123000945640000933 в ОАО «Белгазпромбанк», БИК OLMPBY2X, УНП 291442411, получатель платежа **– ООО «Индустрия Инноваций»**

**Шаг аукциона** – 5 % от начальной цены лота

Условия участия и порядок проведения публичных торгов (аукциона) размещены в открытом доступе на официальном сайте электронной площадки ООО «Индустрия Инноваций» https://iintorgi.by

**Срок подписания договора купли-продажи: 5 (пять) рабочих дней** после публичных торгов (аукциона)

**Условия оплаты предмета торгов (аукциона): 5 (пять) рабочих дней** со дня заключения договора купли-продажи

**Торги проводятся в соответствии с регламентом ООО «Индустрия Инноваций», размещенным по адресу:** https://iintorgi.by

Победитель публичных торгов (аукциона) либо единственный участник публичных торгов (аукциона), согласившийся повысить начальную цену предмета торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение **1,5 % от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней** после проведения публичных торгов (аукциона)

Организатор публичных торгов (аукциона) имеет право снять предмет аукциона с торгов, но не позднее чем за 3 дня до наступления даты проведения торгов (аукциона)

**Дата и время проведения торгов (аукциона):** 11.10.2023 начало торгов: 10.00, окончание торгов: 16.00, электронные торги продлеваются на 3 минуты с момента поступления последней ставки, если ставка сделана менее чем за 3 минуты до времени окончания торгов. Торги проводятся на электронной торговой площадке по адресу: https://iintorgi.by

| | |
|---|---|
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в публичных электронных торгах (аукционе) принимаются по 10.10.2023 г. до 17.00** |
| **Контактные данные** | **Тел.: +375 (17) 300-90-03; +375 (29) 671-83-95; e-mail: e.pinchuk@iin.by** |

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»
**(Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Криница»**

Аукцион состоится **25.09.2023 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1:** Машина стиральная Л-10-211, инв. № 12297.
Начальная цена с НДС 20 % – 1 872,00 руб. Задаток – 300,00 руб.

**Лот № 2:** Пресс гладильный КР-516, инв. № 12396.
Начальная цена с НДС 20 % – 5 400,00 руб. Задаток – 700,00 руб.

**Местонахождение Лотов № 1 и № 2:**
г. Минск, ул. Радиальная, 52. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – 21.09.2023 в 11.00.

**Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

## ЗАО «БелБанкротАукцион»,
организатор торгов по продаже имущества **ООО «Двери Оптом Запад»** (УНП 190987110), объявляет о проведении **21.09.2023 г.** с 9.00 до 16.00 публичных торгов в электронной форме на электронной торговой площадке bankrottorg.by.

Перечень имущества и информация об условиях торгов размещены на сайте электронной торговой площадки: **bankrottorg.by**

## РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона)
**извещает о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего ОАО «Минский Агросервис»**

Аукцион состоится **27.09.2023 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

**Лот № 1:**
1. **Административное здание,** инв. № 600/С-120828, 395,3 кв. м;
2. **Склад,** инв. № 600/С- 120830, 472,6 кв. м;
3. **Мастерская,** инв. № 600/С-120832, 523,1 кв. м;
4. **Комплексная трансформаторная подстанция ГКТП-1346** (160 кВа), инв. № 20040984;
5. **Комплексная трансформаторная подстанция ГКТП-1417** (400 кВа), инв. № 20040985.

Адрес Лота № 1: Минская обл., Минский р-н, г. Заславль, ул. Гагарина, 21А/1; ул. Гагарина, 21а.
Обременения: аренда, ипотека.
Земельный участок 623650100001003002, 0,4868 га.
Право постоянного пользования.
Начальная цена с НДС 20 % – 987 624,95 руб.
Задаток – 100 000,00 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182.
Окончание приема заявлений и задатка – 25.09.2023 в 11.00.

**Организатор аукциона: 220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**☎ 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

Пошук не спыняецца

# ПЕРАРВАНЫ ПАЛЁТ ПЕ-2

## У Магілёве створана асобная група па пошуку ваенных самалётаў, якія не вярнуліся з бою

**Летась на адрас Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру» прыляцеў ліст ад пляменніцы малодшага лейтэнанта Фёдара Кавыршына, які быў штурманам лётнага экіпажа Пе-2. У 1944 годзе самалёт быў збіты падчас бою ў Чавускім раёне. Жанчына прасіла дапамагчы знайсці месца пахавання яе сваяка. Пошукавікі пачалі расследаванне і даведаліся, што ў той жа дзень у адным і тым жа баі былі збітыя аж чатыры савецкія бамбардзіроўшчыкі. Месца падзення баявой машыны, якая пацярпела крушэнне амаль 80 гадоў таму, знайсці практычна немагчыма. Але «віккруўцы» не з тых, хто пасуе перад цяжкасцямі. Тым больш што вопыт работы па пошуку і ўзняцці лётных машын у іх ёсць. Яны не толькі працавалі з новай інфармацыяй, але стварылі асобную групу — «Крылы Перамогі».**

### Не хобі

У савецкі час часта круцілі фільмы пра вайну. І пра лётчыкаў таксама. Дагэтуль у памяці назвы «У бой ідуць адны старыя», «Хроніка пікіруючага бамбардзіроўшчыка», «Нябесны ціхаход». І — песні з іх. *«Туман, туман, слепая пелена / и всего в двух шагах за туманами война / и гремят бои без нас, но за нами нет вины, мы к земле прикованы туманом, / воздушные рабочие войны...»* — гэтыя кранальныя радкі з «Хронікі пікіруючага бамбардзіроўшчыка» часта спявалі каля вогнішча ў турпаходах. Аляксандр Клёмін, браты Міхаіл і Андрэй Нялюбіны, Алена Шутава — касцяк «крылатай» групы — якраз выхаваныя на савецкіх каштоўнасцях. Алена — ваенная пенсіянерка, жыве ў Падмаскоўі, усе астатнія — магілёўчане, людзі працоўныя. Нягледзячы на гэта, Аляксандр і Міхаіл хутка прыйшлі да сустрэчу.

Камандзір групы — Аляксандр Клёмін — выпускнік легендарнай магілёўскай школы № 11, той самай, дзе ў 1941-м размяшчаўся штаб 172-й стралковай дывізіі, якая абараняла Магілёў. Аляксандру пашчасціла захапіцца пошукавай дзейнасцю з дзяцінства, у ваенную гісторыю ён паглыбляўся ў якасці «чырвонага следапыта» пад кіраўніцтвам заслужанай настаўніцы, магілёўскай падпольшчыцы Марыі Базылевай. Аляксандр з усмешкай успамінае, што нават у «Віккру» трапіў на свой дзень нараджэння. Ехаў міма вёскі Гаі, дзе ў 1941-м трымаў абарону гераічны батальён міліцыі, убачыў пошукавікоў, выйшаў і папрасіў даць яму рыдлёўку. Ён жа ўнук былога франтавіка! Яго дзед — Іван Цыплакоў — праз усю вайну праехаў на баявым грузавіку. Зімой па лёдзе Ладажскага возера вазіў прадукты і боепрыпасы ў блакадны Ленінград. Аднойчы з таго пекла вывез сям'ю, якая была на грані смерці.

Міхаіл Нялюбін у клубе адносна нядаўна, але тое, чым займаюцца «віккруўцы», яму таксама вельмі блізка. Яго дзядзька быў партызанам, служыў у НКУС, пасля вайны займаўся ліквідацыяй банд на Палессі. А самалёты наогул для абодвух асобная тэма. У Міхаіла дзед быў лётчыкам, Аляксандр на спартыўных «Яках» у аэраклубе лятаў, служыў у дэсантных войсках. Таму, калі ў клубе паўстала пытанне, каму заняцца самалётамі, шукаць кандыдатаў доўга не прыйшлося.

### Задача з чатырма невядомымі

Памяць — вялікая справа. Дзякуючы пляменніцы Фёдара Кавыршына, якой не даваў супакою лёс яе дзядзькі, выйшлі з небыцця яшчэ некалькі экіпажаў. Пошукавікі падняли архівы, палкавыя данясенні, дзе пахвілінна апісана, як усё было, дзе які самалёт упаў. Неаднойчы выязджалі на месца, апытвалі мясцовых жыхароў. І мазаіка пацыху складваецца. На жаль, не так хутка, як таго хацелася б.

— З дапамогай расійскіх пошукавікоў атрымалася даведацца пра канкрэтныя палкі, — расказваюць суразмоўцы. — З чатырох самалётаў два былі 779-га авіяцыйнага бамбардзіровачнага палка, яшчэ два — 54-га, таго, дзе на Пе-2 ваяваў штурманам малодшы лейтэнант Кавыршын. Збіты Пе-2 упаў на тэрыторыю, дзе знаходзіліся чырвонаармейцы. Кавыршын і камандзір экіпажа малодшы лейтэнант Мяфодзій Ермалаевіч Міжэеў загінулі, а вось стралок-радзіст сяржант Жураўлёў выжыў. Ён вярнуўся ў свой полк, але ў красавіку 1945-га загінуў падчас паветранага бою на тэрыторыі Германіі.



Міхаіл НЯЛЮБІН: «Па нумары гэтай дэталі быў устаноўлены экіпаж малодшага лейтэнанта Ігара Ханжына».

Другі бамбардзіроўшчык гэтага ж 54-га палка, які атрымалася ўстанавіць дзякуючы знойдзенай нумарной дэталі, упаў за 10 кіламетраў ад першага — на той час на акупаваную немцамі тэрыторыю. Пошукавікі цалкам устанавілі яго экіпаж. Гэта камандзір малодшы лейтэнант Ігар Ханжын, штурман малодшы лейтэнант Аляксандр Дрэсвянікаў і радыст-стралок Павел Джэвадаў.

— На сённяшні мы дакладна ведаем склад экіпажаў чатырох бамбардзіроўшчыкаў і месцы, дзе яны разбіліся, — працягваюць аповед пошукавікі. — А вось прывязаць экіпажы да самалётаў атрымалася толькі па адным з іх. Па трох пакуль невядома, хто дзе сядзеў. Гэта магла б падказаць нумарная дэталь, але яе яшчэ трэба знайсці. Выязджаем у вольны ад работы час, шукаем. Працуем выключна на энтузіязме: скінуліся, заправіліся, паехалі. Работа вельмі працаёмкая, шмат зямлі трэба перавярнуць, каб нешта знайсці. Уяўляеце, што гэта такое, калі «Пешку» (самалёт Пе-2. — **Аўт.**) вагой шэсць тон раскідала на дробныя кавалачкі? У радыусе да паўкіламетра, куды ні датыкніся рыдлёўкай, паўсюды метал. Спецпрыборы тут не памочнікі. Трэба разлічваць толькі на свае рукі і чуццё. Для неазнаёмленых мы дзівакі. З боку здаецца, што ідуць мужыкі па закінутым полі і бульбу капаюць.



Міхаіла НЯЛЮБІНА і Аляксандра КЛЁМІНА аб'яднала цікавасць да самалётаў.

### Граната з парашутам

На раскопкі месца, дзе скончыўся баявы шлях экіпажа Ханжына, можна было б ехаць хоць сёння. Але ёсць алгарытм, па якім трэба дзейнічаць. Спачатку падаць заяўку ў выканкам, потым чакаць, калі батальён Мінабароны яе апрацуе і назначыць дату. Карацей кажучы, экіпаж Ханжына вернецца не раней, чым налета. Аляксандр і Міхаіл між тым працягваюць разведкі.

Міхаіл адказны за тэхнічную частку справы. Капаць, не ведаючы што — не эфектыўна, таму пошукавік пералапачвае горы інфармацыі, каб даведацца, дзе якая дэталь у баявых самалётах стаяла. Да таго ж трэба ўлічваць, што яна за той час, што ў зямлі ляжала, магла істотна змяніць выгляд. Было такое, што знайшлі нейкі металічны клубок і не маглі зразумець, што гэта такое і дзе знаходзілася. Міхаіл усё ж такі разгадаў рэбус. Аказалася, што гэта кулямётны станок, які ад удару моцна дэфармаваўся. Пошукавік смяецца, што за апошні час столькі рознай інфармацыі пра савецкія бамбардзіроўшчыкі даведаўся, што мог бы адкрыць сваё канструктарскае бюро. Калі сур'ёзна, то без ведання начынкі самалёта пошукі не мелі б сэнсу.

— Кожны асколак нешта раскажа, напрыклад, пра таўшчыню крыла, — тлумачыць Аляксандр. — Тут і металургам трэба быць у нейкай ступені. Бо самалёты розныя, сплавы таксама. Часам знаходзім спецыфічныя рэчы. На першы погляд, груда металалому. Адкрываем інтэрнэт і пачынаем шукаць. Сплюшчаны кавалачак металу трэба кудысьці падвязаць. Спачатку знаходзім дэталь, потым — месца, дзе яна стаяла ў самалёце, высвятляем, які корпус у фюзеляжа быў — і карцінка пацыху складваецца.

Нельга спісваць з рахунку спадарожныя рэчы. Нават гільза, знойдзеная на месцы падзення самалёта, можа падказаць як мінімум год, калі ён быў збіты. А гэта ўжо лакалізуе кола пошукаў.

Прыйшлося паламаць галаву над адной дзіўнай, на першы погляд, знаходкай. У рукі Міхаіла трапіла адна палова полага чыгуннага шара вагой да 3 кілаграмаў, а Аляксандр знайшоў другую.

— Шукалі адказ нядоўга, але папацець прыйшлося, — кажуць пошукавікі. — Пра гранаты чулі? Уяўляеце, на самалётах іх таксама выкарыстоўвалі. Калі прачыталі, што гэта граната, нават разгубіліся. Але хутка ўсё стала на свае месцы. Гранаты АГ-2 выкарыстоўваліся на бамбардзіроўшчыках, каб адпужваць нямецкія знішчальнікі. У хвасце самалёта ўстанаўліваліся дзве пускавыя трубы, па якіх яны скідваліся, калі варожы знішчальнік прыстройваўся ў хвост. Граната мела парашут, які даваў ёй магчымасць затрымацца ў паветры на некалькі секунд. За гэты час самалёт паспяваў адляцець ад яе на бяспечную адлегласць. А яна ўзрывалася. Нямецкія знішчальнікі трымаліся ад такіх самалётаў на адлегласці як мінімум 700—800 метраў. Бамбардзіроўшчыкам, дзе такога не было, шчасціла менш. Ёсць кінахроніка, дзе відаць, як нямецкі знішчальнік набліжаецца да 20 метраў да савецкага бамбардзіроўшчыка і расстрэльвае яго.

— На самалёце Ханжына такое прыстасаванне дакладна было, — удакладняе Аляксандр. — Мы даведаліся пра гэта з журнала баявых дзеянняў, дзе было пазначана, колькі гранат загружалася. І не толькі гранат. Пасля 1943 года такія журналы вялі вельмі добра. У іх апісана ўсё, што перадавалася на борт, да апошняга патрона. А яшчэ пазначалася, колькі чаго заставалася пасля вяртання з палёту — боепрыпасаў, паліва. Улік быў выразны. Што не скажаш пра першыя гады вайны. Па 1941 годзе зусім мала інфармацыі. Самалёт знаходзіш, а хто лятаў, калі і дзе — невядома. Нават па нумары рухавіка праблемна ўстанавіць экіпаж.

### Сваякі загінулых лётчыкаў, адгукніцеся!

Калі Міхаіл ас па тэхнічнай частцы, то Аляксандр болей спецыялізуецца на пошуках архіўных звестак і родных лётчыкаў. Вельмі часта нашчадкі тых, хто не вярнуўся з вайны, працягваюць шукаць іх, нягледзячы на тое, што прайшло ўжо шмат гадоў. На жаль, бывае інакш. Магчыма, род скончыў сваё існаванне і байцу некуды вяртацца. Але ён у любым выпадку будзе перапахаваны з усімі ўшанаваннямі.

— Шукаў родных Ігара Ханжына і Аляксандра Дрэсвяннікава ў сацсетках, пакуль нічога не атрымалася, — уздыхае Аляксандр. — Будзем прасіць нашу памочніцу Алену Шутаву з Падмаскоўя, каб размясціла інфармацыю на сваім сайце. Яна былая ваеннаслужачая, мае доступ да расійскіх архіваў. І людзі ёй шмат пішуць.

Было б цудоўна, калі б адгукнуліся родныя лётчыкаў яшчэ двух устаноўленых груп экіпажаў — 779-га авіяцыйнага бамбардзіровачнага палка. Гэта камандзір малодшы лейтэнант Аляксандр Чарамісінаў, штурман малодшы лейтэнант Барыс Сасуноў, стралок-радыст Іван Калюжны, а таксама экіпаж у складзе камандзіра малодшага лейтэнанта Івана Галкіна, штурмана малодшага лейтэнанта Івана Фаміна і стралка-радыста Васіля Салоцкага.

Між тым група «Крылы Перамогі» працягвае працаваць яшчэ па сямі самалётах, якія, па інфармацыі мясцовых жыхароў, пацярпелі крушэнне на Магілёўшчыне падчас вайны.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара і з архіва групы «Крылы Перамогі».**



Пошукавікі па дэталях аднаўляюць падзеі амаль 80-гадовай даўніны.

### У тэму

**Мікалай БАРЫСЕНКА, кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру»:**

— У нас даўно наспела неабходнасць стварэння групы, якая займалася б асобна самалётамі. За 29 гадоў існавання клуба мы паднялі пяць самалётаў і ўстанавілі іх экіпажы. Раней кожны з нас патроху самалётамі займаўся, але гэта непрафесійны падыход. Летась, калі мы наткнуліся на вялікую колькасць самалётаў, вырашылі: групе быць. У нас толькі вакол Магілёва з паўсотні самалётаў упала падчас вайны. І ўсе экіпажы — прапаўшыя без вестак. Наш доўг — даць магчымасць ім вярнуцца.

# Ежа як залежнасць

## Што прымушае нас пераяядаць і пры чым тут глутамат натрыю?



**Харчовая дабаўка E621, больш вядомая як глутамат натрыю, папулярная ва ўсім свеце, мода на яе прыйшла ўслед за ўсходняй кухняй, дзе яна выкарыстоўваецца шырока і часта. У заходняй прамысловасці глутамат натрыю дадаецца ў мясныя паўфабрыкаты і супавыя канцэнтраты. Дабаўку, як правіла, ужываюць з мэтай аднавіць або ўзмацніць смак. Аднак дагэтуль наконт глутамату вядуцца шматлікія спрэчкі.**

**Шкодная яна для здароўя ці абсалютна бяспечная? Ці сапраўды яна вядзе да сардэчна-сасудзістых і анкалагічных захворванняў і рызыкі атлусцення? Чаму яна прымушае есці ўсё больш і больш? Пра гэта размаўляем з нейрахірургам, навуковым супрацоўнікам аддзялення пухлін галаўнога мозгу РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава, выкладчыкам кафедры неўралогіі і нейрахірургіі БелМАПА Гумэнам ГАРБАННІДЖАДАМ.**

***— Чаму нам падабаецца шкодная ежа?***

— Агульнавядомы факт, што ў свеце больш людзей штогод памірае ад атлусцення, чым ад голаду. Рэцэптары на нашым языку ўспрымаюць чатыры асноўныя віды смакаў — горкі, салодкі, кіслы, салёны. Але ёсць яшчэ і пяты, ён называецца «ўмамі». І ён — вялікі сябар харчовай прамысловасці і, як ні дзіўна, фармакалогіі.

У 1907 годзе прафесар Такійскага імперскага ўніверсітэта Ікэда Кікунаэ ўпершыню вылучыў рэчыва монасодыум глутамат, больш вядомы ў нас як глутамат натрыю. Яму падабалася, як гатавала яго жонка: ён звярнуў увагу, што яна ўсе стравы рабіла на аснове булёну з водарасцяў. Так у Японіі гатавалі многія жанчыны. Яны выкарыстоўвалі комбу — адну з разнавіднасцяў ламінарыевых водарасцяў, распаўсюджаных у Паўднёва-Усходняй Азіі.

Комбу насамрэч дадаецца ў цяперашні час шмат у якія прадукты, нават ёсць адпаведныя БАДы. Водарасць утрымлівае вялікую колькасць ёду, садзейнічае паляпшэнню работы сэрца, мае супрацьтрамбалітычнае дзеянне, супрацьдзейнічае развіццю рахіту, астэапарозу, карыесу, умацоўвае пазногці і валасы, валодае агульнаўмацавальным імунамадуляцыйным эфектам.

У састаў комбу ўваходзіць глютамінавая кіслата. І Ікэда Кікунаэ ўдалося штучна, шляхам гідролізу соевага і пшанічнага бялкоў, яе сінтэзаваць, яна атрымала назву монасодыум глутамат (MonoSodium Glutamate), скарочана MSG. Натуральны глутамат нічым не адрозніваецца ад харчовай дабаўкі, атрыманай хімічным шляхам. Па знешнім выглядзе яна нагадвае соль.

Японскі вучоны высветліў цікавую рэч: глютамінавая кіслата адносіцца да амінакіслот. А яны неабходны нашаму арганізму. І гэта першы смак, які чалавек успрымае, бо яна знаходзіцца і ў мацярынскім малацэ. Па сутнасці, гэта першы смак, з якім сутыкаецца чалавек.

Па вялікім рахунку, глютамінавая кіслата для арганізма з'яўляецца маркерам бялку: калі ён прысутнічае ў ежы, гэта значыць, ёсць і гэтая амінакіслата. Адпаведна, смак «умамі» — спосаб, якім арганізм знаходзіць багатую бялком ежу. Усе натуральныя прадукты, смак якіх нам падабаецца, утрымліваюць MSG — мяса, рыба, грыбы, сыры, малочныя прадукты. Менавіта таму глутамат такі прыемны для нас на смак, чым і карыстаецца харчовая прамысловасць. А таксама глютамінавая кіслата сінтэзуецца ў арганізме чалавека, яна важная для метабалізму і нервовай сістэмы.

Глутамат натрыю пачалі вырабляць і выкарыстоўваць як прыправу спачатку ў Японіі. Там у продажы ён атрымаў назву «Адзінамота» («сутнасць смаку»). Японскія і кітайскія рэстараны шырока выкарыстоўвалі MSG у сваіх прадуктах, тым больш што водарасць, з якой яе атрымалі, была ім добра вядомая. У канцы 60-х гадоў мінулага стагоддзя, калі кітайскія рэстараны былі распаўсюджаны на тэрыторыі ЗША, дзякуючы выкарыстанню MSG, яны складалі вялікую канкурэнцыю амерыканскім рэстаранам. І апошнія пачалі праводзіць у прэсе вялікую антырэкламу глутамату натрыю: быццам бы дабаўка выклікае галаўны боль, павышае артэрыяльны ціск, выклікае цукровы дыябет і анкалагічныя захворванні. Па сутнасці,



гэта была работа супраць канкурэнтаў.

***— Насамрэч ці ёсць доказы адмоўнага ўздзеяння на здароўе глутамату натрыю?***

— Як мы сказалі, гэта амінакіслата знаходзіцца нават у мацярынскім малацэ. Яна сама па сабе ніякай шкоды не нясе. Праблема палягае ў тым, куды яе дадаюць. Самі амерыканцы хутка зразумелі, што замест таго, каб праводзіць антырэкламу MSG, лепш самім яго выкарыстоўваць — і справы пайшлі.

Насамрэч усё, што мы ўжываем — фастфуд, чыпсы, мясныя паўфабрыкаты — утрымлівае вялікую колькасць глутамату натрыю. Калі гэту дабаўку не дадаць, мы не змаглі б іх з'есці. Тыя ж чыпсы без MSG — нясмачная паста. Не сакрэт, што ежа ў рэстаранах хуткага харчавання не самая здаровая, мяса, якое там выкарыстоўваецца, самае нізкасортнае. Калі прыбраць MSG з каўбасак, сасісак, іншых мясных паўфабрыкатаў, пельменяў, фастфуду, чыпсаў, яны будуць абсалютна нясмачнымі.

Але законы бізнесу дыктуюць узяць самую танную сыравіну, вырабіць і прадаць паболей прадукцыі з максімальным прыбыткам. Кампаніі, якія вырабляюць прадукты харчавання, таксама прытрымліваюцца гэтага прынцыпу. І глутамат натрыю ў гэтым добра дапамагае, бо працуе як наркотык. Кожны, напэўна, заўважаў, што калі адкрывае пачак чыпсаў, немагчыма спыніцца, пакуль апошнія крошкі не дастанеш. Глутамат натрыю актывізуе нейронную сувязь у галаўным мозгу, што гэта ежа ўтрымлівае бялок, значыць, самая лепшая для нас, а па сутнасці падманвае нас і прымушае есці ўсё больш і больш.

Глутамат выклікае залежнасць, і гэтым ён вельмі небяспечны для дзяцей. Калі дзіця карміць прадуктамі, дзе ўтрымліваецца вялікая колькасць MSG, іншыя прадукты харчавання, якія не ўтрымліваюць гэту дабаўку, будуць для яго нясмачнымі цягам жыцця. Гэта як залежнасць у наркамана: есці толькі той прадукт, які ўтрымлівае глутамат.

> **«Усе натуральныя прадукты, смак якіх нам падабаецца, утрымліваюць MSG — мяса, рыба, грыбы, сыры, малочныя прадукты. Менавіта таму глутамат такі прыемны для нас на смак, чым і карыстаецца харчовая прамысловасць».**

Калі дзіця прапанаваць на выбар талерку з грэчкай з катлетай і марожанае, пасыпанае шакаладам, то ён выбера марожанае. У дзіцячым узросце галаўны мозг заўсёды выбера той прадукт, дзе больш калорый, бо арганізм, які хутка расце і шмат рухаецца, мусіць іх назапашваць. А калі да гэтага дадаць глутамат, то выпрацоўваюцца нейронныя сувязі, якія ў далейшым зламаць складана.

У многіх краінах ішлі судовыя працэсы з «МакДональдсам» з прычыны таго, што яны рэкламавалі і прадавалі свае прадукты для дзяцей, такія як «Хэпі Міл», з лялькамі ўнутры. Адметна, што на тэрыторыі ЗША яны забаронены. Там ёсць закон, што ў адну ўпакоўку нельга змяшчаць ядомае і неядомае. Калі дзеці будуць ужываць такую ежу, у дарослым жыцці стануць патрабаваць толькі такія прадукты з вялікім утрыманнем глутамату.




***— А ў чым шкода глутамату для дарослых?***

— Дзякуючы яму чалавек есць вялікую колькасць фастфуду і іншай нізкасортнай ежы. Па сутнасці, з-за глутамату мы не звяртаем увагі на якасць ежы. А да MSG, як правіла, дадаецца вялікая колькасць цукру і солі, якія таксама працуюць як узмацняльнікі смаку. Злоўжыванне імі не нясе таксама ніякай карысці.

Акрамя таго, мы не можам спыніцца, а гэта вядзе да атлусцення. Для дзяцей увогуле бяда — атлусценне, далей цукровы дыябет другога тыпу, гіпертанічная хвароба. Акрамя таго, у такую ежу дадаецца шмат фарбавальнікаў, каб прывабіць знешне. Яны нясмачныя і некаторыя нават канцэрагенныя, і, калі мы дадаем MSG, нам хочацца такога прадукту яшчэ і яшчэ.

Добра, што ўдалося выключыць сасіскі і пельмені са школьнага харчавання, але калі б і дома дзеці іх не ўжывалі, было б выдатна.

***— Чаму ў Амерыцы так шмат людзей з атлусценнем?***

— Там гэта нацыянальная праблема. Законы бізнесу ніхто не адмяняў. І кампаніі-гіганты, якія вырабляюць прадукты харчавання, таксама выкарыстоўваюць гэтыя прыёмы для свайго прыбытку. З імі складана змагацца. Напрыклад, нядаўна было афіцыйна заяўлена, што штучны цукар — гэта канцэраген, які выклікае рак. Але ў рэкамендацыях не пішуць адмяніць цукразамяняльнік у прадуктах харчавання. Гэта немагчыма зрабіць, бо тады трэба забараніць дыетычную колу, жавальныя гумкі, якія не ўтрымліваюць натуральнага цукру. Аўтаматычна выпадае сотні, калі не тысячы прадуктаў.

Гэтыя харчовыя гіганты дастаткова ўплывовыя, тыя ж Coca-Cola і Pepsi-Cola зарабляюць мільярды па ўсім свеце, і супрацьстаяць ім вельмі цяжка.

***— Якія прадукты ўтрымліваюць найбольш глутамату?***

— Існуюць сайты, дзе мы можам знайсці інфармацыю па колькасці MSG у тым ці іншым прадукце харчавання. На першых месцах — фастфуд, чыпсы, сасіскі, пельмені.

***— Чаму глутамат любяць не толькі харчовыя, але і фармацэўтычныя кампаніі?***

— Калі ў прадукты дадаецца вялікая колькасць MSG, солі і цукру, пад іх прыкрыццём можна з'есці ўсё што хочаце. І няважна, што ў складзе можа быць канцэраген. Да таго ж мы з'ядаем больш чым патрэбна, бо пачуццё сытасці прытармажваецца, а гэта выклікае атлусценне. І вядзе да цукровага дыябету другога тыпу, сардэчна-сасудзістых захворванняў, гіпертанічнай хваробы і злаякасных пухлін.

Такім чынам, дзякуючы MSG уключаецца ў продаж вялікая колькасць лекаў для лячэння цукровага дыябету, зніжэння артэрыяльнага ціску, паляпшэння работы сардэчна-сасудзістай сістэмы і супрацьпухліннае лячэнне. Фармацэўтычныя кампаніі таксама прытрымліваюцца законаў бізнесу: чым больш прададзена, тым большы прыбытак.

Так што сам па сабе глутамат натрыю не шкодны, але шкодная тая ежа, куды ён дадаецца, і колькасць, у якой мы яе паглынаем. Але ён прыносіць добры прыбытак харчовым і фармакалагічным кампаніям.

***— Ці імкнецца з гэтым неяк змагацца навуковая ці медыцынская супольнасць?***

— У ЗША, Еўропе і іншых развітых краінах гэта вялікая праблема. Людзі ўжываюць вялікую колькасць шкоднай ежы, замаскіраванай узмацняльнікамі смаку, і гэта выклікае вялікую колькасць захворванняў. Дзяржавам даводзіцца траціць вялікія грошы на аздараўленне насельніцтва.

Сёння вядуцца размовы, каб рабіць наклейкі «здаровая ежа» ці, наадварот, «шкодная» на ўпакоўкі — па аналогіі з цыгарэтамі. У такіх краінах, як Мексіка і Венесуэла, такія наклейкі ўжо прымяняюцца. Тое ж хочуць укараніць і на еўрапейскім рынку. Бо самастойна нам разбірацца ў вялікай колькасці дабавак Е, напісаных да таго ж дробным шрыфтам, даволі няпроста. Наклейкі маглі б аблегчыць задачу. Канешне, гэта будзе вялікі ўдар па харчовых кампаніях і наўрад ці будзе імі вітацца.



**Алена КРАВЕЦ**

# РАЙСКІ САД

*(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)*

Для дасягнення аптымальнага выніку неабходна ўважліва вызначыцца і з сортам, і з якасцю саджанца, гаворыць суразмоўнік. То-бок варта ўважліва прачытаць апісанне — інфармацыі сёння хапае, і знайсці яе не праблема нават па самых рэдкіх сартах. Хоць у асноўным пакупнікі аддаюць перавагу не «экзотыцы», а праверaным варыянтам, гаворыць прадаўцы.

— Асабіста я кіруюся Дзяржаўным рэестрам сартоў Рэспублікі Беларусь, там ёсць пералік сартоў айчыннай селекцыі і замежных, раянаваных у нас, — кажа суразмоўнік.

— Якасць любых саджанцаў павінна пацвярджацца адпаведнымі дакументамі, — распавядае прадавец Ірына. Жанчына прадае саджанцы ўласнай вытворчасці. — І пра гэтыя дакументы пакупніку абавязкова трэба пытацца. Калі іх няма, варта проста прайсці міма такіх раслін.

Яна кажа, што лепш за ўсё прыжывуцца, зразумела, тыя саджанцы, якія «нарадзіліся» і падрасталі ў гадавальніках паблізу ад вашага зямельнага ўчастка.

— Часам можна пачуць меркаванне, што купляць саджанцы варта толькі ў гадавальніках і садовых цэнтрах, — кажа суразмоўніца. — Але цэнтральныя рынкі — таксама бяспечныя гандлёвыя аб'екты для набыцця саджанцаў пладовых дрэў і ягадных кустоў. Тут прадаўцы зацікаўлены ў якасці пасадачнага матэрыялу не менш за пакупнікоў. Так бы мовіць адчуваем адказнасць, бо людзі ўкладуць у гэтыя расліны сілы і надзеі. І калі надзеі не апраўдаюцца, яны абавязкова вернуцца, каб выказаць прэтэнзіі. Але пакуль што нашы пастаянныя пакупнікі выказваюць у асноўным падзяку, — усміхаецца яна.

— Купляйце саджанцы толькі ў правераных месцах! — падкрэсліваюць прадаўцы. — Не ў пераходах, не каля аўтадарог. Там вялікі шанец натрапіць на падман: напрыклад, сорт будзе не адпавядаць заяўленаму. Плюс самі саджанцы могуць быць падсохлымі, а калі вы садоўнік-пачатковец, гэтага можаце і не заўважыць.

Але, дапусцім, саджанцы жывыя і здаровыя. І тут вас падцікоўваюць і іншыя падводныя камяні — тонкасці выбару, вядомыя дасведчаным садоўнікам і яшчэ не спасцігнутыя пачаткоўцамі.

— Якім бы прыгожым ні быў пасадачны матэрыял, перш за ўсё саджанец павінен валодаць такой якасцю, як зімаўстойлівасць, — сцвярджае Ірына. — А гэта якасць у першую чаргу вызначаецца раянiраваннем. То-бок саджанцы з рэгіёнаў з мякчэйшым, чым у вас, кліматам не раскрыюць свой патэнцыял у вашым садзе. Нашы саджанцы, дарэчы, з гадавальніка пад Мінскам.

Найбольшым попытам, як запэўніваюць прадаўцы, у садаводаў сёння карыстаюцца яблынькі, грушы, вішні і слівы. У гэтым годзе ёсць вялікі попыт і на абрыкосавыя дрэўцы і персік — клімат мяняецца, у нас становіцца цяплей... З кустоў цікавыя пакупніку, напрыклад, бружмель, буякі, чарнаплодная рабіна. Цэны на рынках досыць высокія: саджанцы вінаграду розных сартоў — каля 15 рублёў за штучку, яблыні і грушы — у сярэднім 25 рублёў, двухгадовы персік айчыннага сорту «Лойка» — аж 40 рублёў.

## Глядзім у корань

У асартыменце — маладыя дрэўцы і кусты як з адкрытай, так і з закрытай каранёвай сістэмай. Прычым калі другія ў продажы могуць быць і не ў пасадачны сезон, то час першых хуткацечны: толькі ўвосень, ну і трохі ўвесну. Пачнём з гэтых, «эксклюзіўных». Іх плюс — магчымасць убачыць каранёвую сістэму на свае вочы і ацаніць яе якасць.

— Калі каранёвая сістэма не аб'ёмная, саджанец лепш не купляць, — каментуе прадавец. — А калі саджанцы падмерзлі, у іх будзе лупіцца кара, а на каранях з'явяцца патаўшчэнні.

— Дык якія карані добрыя?

— Вось такія, — паказвае. — Іх шмат: і асноўных, і дробных карэньчыкаў. Яны моцныя, пругкія, прыгожыя і нават візуальна выглядаюць здаровымі. Такая каранёвая сістэма гарантуе прыжыванне дрэўца.

Агледзеўшы карані, ацэньваем на ствол. Кара на ім не павінна быць патрэсканай ці зморшчанай. І яшчэ адзін нюанс — узрост саджанца. Высокія і прыгожыя дрэўцы могуць быць занадта дарослымі, нават калі нядобрасумленны прадавец сцвярджае адваротнае. Трох-чатырохгадовыя расліны ўжо не здольныя лёгка прыжыцца — хутчэй за ўсё, яны будуць хварэць на новым месцы. Ідэальны варыянт — дрэўца ўзростам год ці два.

Саджанец у кантэйнеры — нядрэнны варыянт, калі абраць яго правільна. Каранёвай сістэмы ў такіх дрэўцаў, як правіла, не відаць. І тут крытэрыі выбару іншыя (хоць што да кары і ствала, усе вышэйпералічаныя прыкметы дзейнічаюць). Але ж у любога саджанца галоўнае — карані. Таму звяртаем увагу на грунт у кантэйнеры. Ён павінен быць шчыльным, можа быць, нават з налётам моху. І калі пацягнуць за ствол, дрэўца павінна выходзіць з ёмістасці з камяком глебы. Гэта значыць, што саджанец «сядзіць» у гаршку даўно, выдатна прыжыўся і гэта добры пасадачны матэрыял, распавялі прадаўцы. Калі дрэўца лёгка выдзіраецца з ёмістасці, а зямля застаецца — значыць, пасадзілі ў гэты гаршок расліну нядаўна, і яе шанцы прыжыцца прыкметна падаюць.

— Кантэйнер павінен быць вялікі, — дадае Ірына. — Чым большая ёмістасць, тым больш шырокая каранёвая сістэма.

Калі казаць пра пасадачны матэрыял ягадных кустоў, асноўным крытэрыем выбару таксама выступае каранёвая сістэма — яна павінна быць вельмі разгалінаванай і доўгай — не менш за 15 см. Маладыя кусцікі павінны мець не адзін-два, а некалькі шкілетных адраўнелых парасткаў з гладкай і прыгожай карой без пашкоджанняў, расказалі прадаўцы.

— Ідэальныя для восеньскай пасадкі з кустоў маліна, агрэст, бружмель і любыя віды парэчкі, — дзеліцца дачніца Таццяна. — А з пладовых дрэўцаў — марозаўстойлівыя сарты яблынь і груш.

## З пункту гледжання навукі

— Цяпер купляць пасадачны матэрыял пладовых дрэў яшчэ ранавата, саджанцы працягваюць расці, верхавінная почка ў многіх яшчэ не склалася, — адзначае **загадчык аддзела гадавальнікаводства РУП «Інстытут пладаводства», кандыдат сельскагаспадарчых навук Васіль ЛЯЎШУНОЎ**. — Лепш рабіць такія пакупкі бліжэй да канца верасня. Тэрміны восеньскай пасадкі пачынаюцца з канца верасня і завяршаюцца прыкладна за два тыдні да наступлення ўстойлівага прамярзання глебы, а гэта ўвесь кастрычнік і частка лістапада.

***— Васіль Аляксандравіч, як правільна выбраць саджанцы?***

— Пачнём з саджанцаў з закрытай каранёвай сістэмай. Крытэрый, што такія саджанцы добра перанясуць перасадку, — тое, што каранёвая сістэма цалкам асвоіла аб'ём кантэйнера: карані аплятаюць камяк субстрату. Перад пакупкай варта папрасіць прадаўца паспрабаваць дастаць саджанец з кантэйнера. Калі вы ўбачыце, што камяк не рассыпаецца, карані добра аплятаюць яго, саджанец доўгі час рос і развіваўся ў гэтым кантэйнеры і прыжывецца на новым месцы. Калі ж дрэўца лёгка выдзіраецца, субстрат рассыпаецца, а каранёвая сістэма застаецца практычна «голай», у кантэйнер саджанец быў пасаджаны нядаўна і яшчэ не адаптаваўся. Ад такой пакупкі варта ўстрымацца.

***— Саджанцы з закрытай каранёвай сістэмай, набытыя цяпер, можна пасадзіць і вясной?***

— Калі вы набылі якасныя саджанцы, то так. На зімовае захоўванне саджанцы з закрытай каранёвай сістэмай закладваюцца пры тэмпературы 0 плюс-мінус 2 градусы ў падвальныя памяшканні з высокай вільготнасцю (больш за 90 %). Можна захоўваць на працягу зімы і саджанцы з адкрытай каранёвай сістэмай: іх прыкопваюць у адкрытым грунце, у нахільным становішчы, уцяпляюць пілавіннем і лапнікам, зімой праводзяць меры барацьбы супраць грызуноў. Вясновая пасадка аптымальная для костачкавых культур, але, паколькі асартымент сартоў костачкавых (вішні, чарэшні, слівы, алычы, абрыкоса і персіка) увесну меншы, чым увосень, садаводы набываюць іх у верасні—кастрычніку і захоўваюць да вясны. Хоць костачкавыя высаджваюць і ў восеньскія тэрміны, прытым даволі паспяхова. Яблыні і грушы высаджваюць як увосень, так і ўвесну. Плюс восеньскай пасадкі ў тым, што садоўнік мае больш працяглы час, а вясновыя тэрміны пасадкі пладовых дрэў кароткія.



***— Як выбраць саджанцы з адкрытай каранёвай сістэмай?***

— Звяртаем увагу на карані і знешні выгляд раслін. Кара не павінна быць зморшчанай — прыкмета таго, што саджанцы падсохлыя. Таксама на кары не павінна быць апёкаў, механічных пашкоджанняў. Саджанец павінен быць роўны. Зразумела, што ў месцы прышчэпкі будзе патаўшчэнне, але ў расліны не павінна мець моцнага скрыўлення. Каранёвая сістэма павінна быць разгалінаванай, без цвілі. Папрасіце прадаўца сагнуць адзін карэньчык. Калі ён гнецца, але не ламаецца, — карані жывыя. Калі ламаецца — карані падсушаныя.

***— На што звярнуць увагу ў пытанні прышчэпы?***

— Прышчэпы, на якіх рэкамендуецца вытворчасць саджанцаў, адрозніваюцца адаптаванымі ўласцівасцямі, прыдатнымі для нашай краіны, — гэта, у прыватнасці, зіма- і марозаўстойлівасць. Калі саджанцы выраблены на раянiраваных прышчэпах, то яны прайшлі выпрабаванні і характарызуюцца станоўчымі якасцямі. Аб тым, якая прышчэпа, інфармацыя змяшчаецца ў дакументах на саджанцы. Гэтыя дакументы, паўтаруся, павінны мець прадаўцы пасадачнага матэрыялу.



Дачнікам аптымальна выбіраць падвоі для яблыні 54-118, 62-396, ММ-106, М-9; для грушы — груша дзікая лясная (насенны падвой), а з клонавых — ВА-29 і С1.

***— Важны крытэрый выбару саджанца — яго вышыня...***

— Так, вышыня дакладна вызначана ў кожнай групы саджанцаў. Для аднагадовага саджанца яблыні мінімальная вышыня — 90—100 см, для грушы — каля 110—120 см. У двухгадовых саджанцаў абедзвюх культур павінен быць сфарміраваны штамб, расліна павінна мець бакавыя парасткі. Якасны аднагадовы саджанец вішні мае вышыню надземнай часткі парадку 100 см, чарэшні — 120 см, абрыкоса — каля 110 см.

***— Садоўніку-аматару лепш выбіраць аднагадовыя або двухгадовыя саджанцы?***

— Існуе меркаванне, што чым саджанец маладзейшы, тым лягчэй прыжываецца. Але двухгадовы саджанец у перспектыве пацешыць вас ураджаем раней аднагадовага. І калі гэта якасны саджанец з добрай каранёвай сістэмай, дапушчальна аддаць перавагу двухгодкам.

***— Што сёння ў модзе ў садаводаў-аматараў?***

— Абрыкос і персік. Гэта тыя дзве культуры, на якія апошнія некалькі гадоў стала больш попыту. Іх лепш высаджваць увесну, захоўваючы пасадачны матэрыял на працягу зімы. Некалькі гадоў таму ў нас не было ніводнага сорту персіка, але сёлета раянiраваны першы сорт беларускай селекцыі «Лойка». І людзі ўжо мэтанакіравана тэлефануюць, цікавяцца, жадаюць купіць саджанцы. Попытам карыстаецца і чарэшня. З кустоў у модзе буякі, а таксама бружмель — самыя першыя ягады, якія спеюць раней за суніцы.

***— Якія сарты яблынь і груш лепш выбіраць?***

— Напачатку садоўнік павінен вызначыцца, чаго ён жадаў бы зыходзячы са сваіх запатрабаванняў. Для сям'і патрэбны і сарты летніх тэрмінаў паспявання, і восеньскіх, і, зразумела, зімовых, якія будуць доўга захоўвацца. У гэтым выпадку летніх сартоў павінна быць працэнтаў 15-20, а аснову складуць восеньскія і зімовыя. Іншы варыянт: дапусцім, захоўваць ураджай няма дзе. У гэтым выпадку сартавы склад зміняецца ў бок прыярытэту летняга і восеньскага тэрміну паспявання. Вызначыўшыся з гэтым пытаннем, выбіраем сарты ў Дзяржаўным рэестры. Гэта афіцыйны дакумент, дзе па абласцях пералічаны раянiраваныя сарты. Заўважу, што апроч айчынных там прысутнічаюць і сарты заходняй селекцыі, але толькі тыя, якія добра паказалі сябе ў беларускіх умовах.

***— На якія айчынныя сарты садоўнікам-аматарам варта звярнуць увагу?***

— Па яблыні з ранніх гэта сорт «Ранак», таксама з навінак можна звярнуць увагу на сарты «Крапач», «Паланэз». Гаворачы аб грушы, не магу не згадаць сорт «Проста Марыя» — гэты восеньскі сорт ужо стаў брэндам. З ранніх сартоў ігрушы выдатны ўраджай гарантуе «Кудесніца», добры гатунак — «Завея», зімовага тэрміну спажывання. Персік — вядома, «Лойка», абрыкос — новы сорт «Дэбют», а таксама больш вядомы сорт «Спадчына». Сарты абрыкоса «Камея» і «Лявон» цяпер на дзяржвыпрабаванні. Таксама на выпрабаванні — чарэшня «Беліца» з жоўтымі пладамі. Гэта інфармацыя дачнікам на перспектыву. А з таго, што ўжо занесена ў рэестр, выбар па чарэшні вялікі: напрыклад, з апошніх распрацовак — вельмі добрыя сарты «Марыя» і «Мінчанка».

У канцы верасня на тэрыторыі Інстытута пладаводства таксама разгортваецца сезонны продаж саджанцаў. І, дарэчы, апроч гарантаванай якасці пакупнік атрымлівае эканомію. Саджанцы абрыкоса і персіка тут абыдуцца ў 25 рублёў (супраць 40 рублёў на Камароўцы), пасадачны матэрыял іншых пладовых культур — ад 11 рублёў. За пасадачны матэрыял буякоў прыйдзецца выкласці каля 12—15 рублёў, а ў цэлым цэны на саджанцы ягадных кустоў тут стартуюць з 4,5—5 рублёў.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

## ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению открытого акционерного общества «Гомельхлебпром» (продавец) извещает о проведении 20 сентября 2023 года открытого аукциона по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20, 2-й этаж

| № лота | Наименование предметов торгов | Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб. | Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | **Изолированное помещение с инв. № 330/D-45053,** общей площадью **949,8 кв. м**, назначение – торговое помещение, наименование –магазин № 36. Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Чапаева В.И., 26-49. **Информация о земельном участке:** расположено на земельном участке с кадастровым номером **323550100007000051** площадью **0,0992 га (право постоянного пользования). Доля в праве 3/10**. **Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Чапаева В.И., 26. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания многоквартирного жилого дома с изолированным помещением магазина № 36. **Ограничение (обременение):** ипотека в ОАО «Белагропромбанк» (есть разрешение банка на реализацию) | **1 591 200,00** | 159 120,00 |
| 2 | **Изолированное помещение с инв. № 330/D-45052,** общей площадью **93,1 кв. м**, назначение – торговое помещение, наименование – магазин № 2. Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Веры Хоружей, 10-57. **Информация о земельном участке:** расположено на земельном участке с кадастровым номером **341500000010000061** площадью **0,1112 га (право постоянного пользования). Доля в праве 123/5000. Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Веры Хоружей, 10. **Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания жилого дома, встроенного помещения отделения № 317/12 филиала № 317 ОАО «АСБ «Беларусбанк» и магазина «Свежий хлеб». **Ограничение (обременение):** ипотека в ОАО «Белагропромбанк» (есть разрешение банка на реализацию) | **94 920,00** | 9 492,00 |
| 3 | **Изолированное помещение с инв. № 330/D-45050,** общей площадью **75,9 кв. м**, назначение – торговое помещение, наименование – изолированное помещение магазина № 15. Адрес: Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Студенческая, 44-77. **Информация о земельном участке:** расположено на земельном участке с кадастровым номером **323550100014000020** площадью **0,1326 га (право постоянного пользования). Доля в праве 39/1000**. **Местоположение (адрес):** Гомельская обл., Мозырский р-н, г. Мозырь, ул. Студенческая, 44. **Целевое назначение земельного участка:** для обслуживания многоквартирного жилого дома с изолированным помещением магазина № 15. **Ограничение (обременение):** ипотека в ОАО «Белагропромбанк» (есть разрешение банка на реализацию) | **88 080,00** | 8 808,00 |
| 4 | **Капитальное строение с инв. № 350/С-158272**, общей площадью 32,3 кв. м, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание неустановленного назначения (проходная с весами. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 120/2).<br>**Изолированное помещение с инв. № 350/D-274318**, общей площадью **4014,7 кв. м**, назначение – помещение многофункциональное, наименование – помещение хлебопекарного цеха с административно-хозяйственными помещениями. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 120-1. **Ограничение (обременение):** ипотека в ОАО «Белинвестбанк» (есть разрешение банка на реализацию).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-158908**, общей площадью **500,4 кв. м**, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад материально-технический). Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 120/5. **Ограничение (обременение):** ипотека в ОАО «Белинвестбанк» (есть разрешение банка на реализацию).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-158268**, общей площадью **559,1 кв. м**, назначение – здание многофункциональное, наименование – здание многофункциональное (мастерская, вспомогательный корпус). Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 120/1. **Ограничение (обременение):** ипотека в ОАО «Белинвестбанк» (есть разрешение банка на реализацию).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-158927**, общей площадью **81,5 кв. м,** назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ; наименование – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ (склад мокрого хранения соли). Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 120/4. **Ограничение (обременение):** ипотека в ОАО «Белинвестбанк» (есть разрешение банка на реализацию).<br>**Капитальное строение с инв. № 350/С-158324**, общей площадью **8,6 кв. м**, назначение – здание неустановленного назначения, наименование – здание неустановленного назначения). Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 120/3.<br>**Объекты расположены на земельном участке с кадастровым номером 340100000005005704** площадью **1,4141 га (право постоянного пользования). Доля в праве 1/1. Целевое назначение земельного участка:** для содержания и обслуживания зданий и сооружений хлебозавода № 2.<br>**Инженерная сеть с инв. № 350/С-226619**, протяженность – 9 м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водопроводная сеть (водопровод внутренний). Адрес: Гомельская область, г. Гомель, водопроводная сеть (водопровод внутренний) от здания до здания по ул. Барыкина, 120.<br>**Инженерная сеть с инв. № 350/С-226615**, протяженность – 207,7 м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – водопроводная сеть. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, водопроводная сеть от ВК1 до зданий по ул. Барыкина, 120.<br>**Инженерная сеть с инв. № 350/С-226617**, протяженность – 316,9 м, назначение – сооружение специализированное водохозяйственного назначения, наименование – канализационная сеть. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, канализационная сеть от зданий по ул. Барыкина, 120 до КК14.<br>**Инженерная сеть с инв. № 350/С-226618**, протяженность – 9,6 м, назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – газопровод (наружный). Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, газопровод (наружный) от здания ГРП до здания по ул. Барыкина, 120.<br>**Инженерная сеть с инв. № 350/С-226616**, протяженность – 46,5 м, назначение – сооружение специализированное энергетики, наименование – газопровод. Адрес: Гомельская обл., г. Гомель, газопровод от границы сооружения до здания ГРП по ул. Барыкина, 120.<br>**Инженерная сеть** – теплотрасса (сталь), инв. № 00003918, протяженность – 12,6 м, расположенная по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Барыкина, 120.<br>**Недвижимое улучшение** – ограждения контейнеров для мусора, инв. № 00003911, материал – блоки из ячеистого бетона, протяженность – 11 м, расположенное по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, по ул. Барыкина, 120.<br>**Также в состав лота № 4 входит:** щит № 8 с инв. № 3805, щит № 7 с инв. № 3806, щит № 6 с инв. № 3807, щит № 2 с инв. № 3808, щит № 5 с инв. № 3809, блок кондиционера внутренний (3 этаж) с инв. № 3833, электрощит № 2 с инв. № 3853, сплит-система с инв. № 3861, трансформатор ТМ-180 с инв. № 3927, распределительное устройство РУ-6 с инв. № 3928, распределительное устройство РУ-0,4 с инв. № 3929, холодильная камера для заморозки с инв. № 3930, щит с перекидным рубильником IP54 с инв. № 3945, щит распределительный ВРYI 54 с инв. № 3946, щит управления ЩУН с инв. № 3947, кондиционер SHIYAKI с инв. № 3957, кондиционер Hyundai с инв. № 3963, кондиционер КИТАНО с инв. № 3970, внутренний блок кондиционера Hyundai с инв. № 3976, наружный блок кондиционера Hyundai с инв. № 3977, ворота секционные из сендвич-панелей с калиткой с инв. № 3981, весы автомобильные с инв. № 2024, шкафная установка с инв. № 2291, конденсаторная установка с инв. № 2546, емкость для муки с инв. № 2558, емкость для муки с инв. № 2559, емкость для муки с инв. № 2560, емкость для муки с инв. № 2561, емкость для муки с инв. № 2562, емкость для муки с инв. № 2563, трансформатор ТМ-400 с инв. № 2607, лифт грузовой ПГ 287М с инв. № 3300, котел КГФ 1000 с инв. № 3534, автоматика контроля герметичности с инв. № 3761, автоматика контроля герметичности с инв. № 3762, компрессор с инв. № 3776, компрессор 4ВУ-54 с инв. № 3777, холодильная камера АК-2 CCSY-H-DH с инв. № 3900, котел паровой КП-0,5-0,9 с ящиком управления и горелкой с инв. № 3902, система подогрева воды с инв. № 3933, котел паровой КП-0,5 с инв. № 1040050 | **4 130 424,00** | 413 042,00 |

**Продавец:** открытое акционерное общество «Гомельхлебпром», 246045, г. Гомель, ул. Интернациональная, 8. Порядок ознакомления с имуществом (осмотр) и заключение договора купли-продажи осуществляется по контактному тел. **8 (029)122-89-32 Бондаренко Юрий Владимирович. Шаг аукционных торгов – 5 (пять) % от начальной цены предмета аукциона.**

**Для участия в аукционе необходимо:**

**1.** Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца торгов (Открытое акционерное общество «Гомельхлебпром»):** р/с BY55 BLBB 3012 0400 0106 7400 1001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНП 400010674, БИК BLBBBY2X, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту №_ (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления).

**2.** Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно **с 11 сентября 2023 г.** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и 14.00 до 16.00.

Прием заявлений для участия в аукционе **заканчивается 18 сентября 2023 г. в 16.00 включительно (предварительно по контактным телефонам Организатора торгов).** Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три календарных дня до его проведения.

